Юбілей Яна Чыквіна ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Андрэй Лянкевіч ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 22 (2820) Год LV | Беласток, 30 мая 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Беластоцкі фестываль

Помышляю день страшный,
и плачуся деяній моихъ лукавыхъ:
како отвещаю безсмертному Царю?
Коимъ же дерзновеніемъ воззрю на Судію
блудный азъ?

Гімн на прыведзеныя вышэй словы Аляксандра Архангельскага, які ўпершыню пачуў я амаль сорак гадоў таму з вінідыска балгарскага „Балкантону", заняў у маім рэлігійным топ-парадзе такое ж месца, як у свецкім *evergreen* „Очи чёрные". Цяпер ізноў пачуў я шэдэўр Архангельскага ў велічным выкананні хору Варшаўскага ўніверсітэта ў канцэртнай зале Беластоцкай філармоніі ў рамках XXIX Фестывалю царкоўнай музыкі „Гайнаўка".

І *плачуся деяній моихъ,* магчымых пры крананні рэлійных спраў, далікатных, дзе, *блудный азъ,* магу дапусціць нейкія неапраўдальныя *лукавыя* меркаванні.

Такі вось, *блудный азъ,* палез я на грэшнае дрэва пазнання, у біблейскі тэкст, каб пабачыць там, як калісь адбываліся рэлігійныя спевы. 32-гі псалом (паводле візантыйскай нумерацыі; 33-ці паводле лацінскай) заклікае ўсхваляць Усявышняга гімнапеннямі з акампанементам струнных інструментаў. Іншыя абзацы Бібліі згадваюць пра арфы, тамбурыны, трубы, цымбалы... Аднойчы ад такой музычнай какафоніі варожае войска панічна разбеглася (2 Пар., 20:22). З ходам часу рэлігійныя чыны сталі фільтраваць сакральную музыку — мабыць, каб яе людзі надта не палохаліся — паслядоўна забараняючы ўжыванне інструментаў і зараз на Захадзе асталіся толькі трубкі ў арганах, а на Усходзе выключна вакал.

На сёлетні Фестываль прыехалі выканаўцы царкоўнай музыкі з еўрапейскай традыцыйна праваслаўнай прасторы — Сербіі і сербскай часткі Босніі, Малдовы, Грузіі, Украіны, Расіі і Беларусі — ды з вельмі блізкага да яе замежжа — Эстоніі, Літвы і нашай Польшчы. У катэгорыі прыхадскіх хароў выступілі: хор „Mariawita" з падлодзінскага Стрыкава, хор Свята-Сімяонаўскай царквы з памежнага з нашым Падляшшам Камянца (атрымаў вылучэнне), хор Свята-Мікалаеўскай царквы з Вільні (3-е месца) ды маладзёжны хор Свята-Мікалаеўскай царквы з Кіева (1-е месца). У катэгорыі аматарскіх свецкіх хароў паказаліся: камерны хор горада Сергіеў Пасад (раней Загорск, Расія), камерны хор „Март-акорд" з Масквы, хор „Viva la Musica" з Адэсы і маладзёжны камерны хор „Atžalynas" з літоўскага Шаўляй (гэтыя два хары ўзялі два раўнапраўныя трэція месцы), хор Медыцынскай акадэміі з Вроцлава (2-е месца), Акадэмічны хор Варшаўскага ўніверсітэта ды камерны хор „Salutaris" з Мінска (два раўнапраўныя першыя месцы). Выступілі два дзіцяча-маладзёжныя хары: дзявочы гурт „Лікрын" з Кіева (2-е месца) ды дзіцячы хор Літоўскага радыё і тэлебачання з Вільні (1-е месца). У катэгорыі хароў музычных вучэльняў выступілі: хор „Gaudeamus" Дзяржаўнага музычнага ўніверсітэта з Бельцаў (Малдова) і камерны хор Музычнай акадэміі з Усходняга Сараева (два раўнапраўныя трэція месцы), жаночы камерны хор Дзяржаўнага музычнага каледжа з Гродна (2-е месца), жаночы хор Дзяржаўнага музычнага каледжа імя Рымскага-Карсакова з Пецярбурга ды хор „Collegium Musicum" Дзяржаўнага мастацкага ўніверсітэта ў Бялградзе (два раўнапраўныя першыя месцы). У катэгорыі прафесіянальных хароў: Дзяржаўны ансамбль Аджарскай Рэспублікі „Батумі" з аднайменнага горада ў Грузіі (вылучэнне; цікава ведаць, што гэты калектыў прыехаў у Беласток дзякуючы асабістым захадам першай дамы Грузіі, спадарыні Саакашвілі), вакальны ансамбль „Orthodox Singers" з Таліна (3-е месца), хор Вроцлаўскай філармоніі і Данская харавая капэла „Анастасія" з Растова-на-Доне (два раўнапраўныя другія месцы) ды Кіеўская мужчынская харавая капэла імя Рэвуцкага (першае месца). Індывідуальныя вылучэнні атрымалі Дарынка Мацій-Маравіч з Бялграда (дырыжор) ды Кшыштаф Халімонюк (Варшава) і Валянціна Іваненка (Кіеў) — салісты. На фестывалі быў таксама адзначаны 80-гадовы юбілей выдатнага польскага кампазітара царкоўнай музыкі Рамуальда Твардоўскага.

Выступленні ўсіх выканаўцаў былі вялікай малітвай, праспяванай ад душ спевакоў. Не буду я тут ахаў і охаў над кожным нумарам фестывальнай праграмы, бо і так немагчыма на паперы перадаць усіх уражанняў, духоўнай насалоды ад запрэзентаванага малітоўна-вакальнага мастацтва. Усё ж такі для двух момантаў зраблю выключэнне.

Мяне, суб'ектыўна, найбольш захапіла велічнае выкананне пачатковага псалма Псалтыра кіеўскімі мужчынамі. Іхні спеў вынес мяне ў стан нірваны, адкуль я мог прыкласці вуха да Раю. Дарэчы, і публіка ў часе завяршальнага канцэрта доўга-доўга не адпускала кіеўскіх спевакоў са сцэны.

Другі момант гэта адрас баснійскага хору — Усходняе Сараева. Гэты тапонім гучыць як Усходні Берлін, Паўночны В'етнам ці Паўночная Карэя. Гэта таксама след вайны, крывавая пляма перанесеная 21-му 20-м стагоддзем. *Помышляю день страшный?..*

XX стагоддзе прынесла *день страшный* згаданаму ўжо Аляксандру Архангельскаму. У 1923 годзе ён пісаў аднаму з сябраў: „... у нас в перспективе — голод. В свою усадьбу я ехать не могу, потому что там уже всё расхищено «товарищами», и я не знаю, куда мне приклонить голову..." Годам раней ён быў прымушаны пакінуць заснаваны сабою пецярбургскі хор і падацца ў Маскву. Гледзячы на адрас „гайнаўскага" фестывалю складваецца ўражанне, што і ў XXI ст. не звяліся рэлігійныя бальшавікі; яны вынырнулі ў нас...

У беластоцкім XXIX фестывалі царкоўнай музыкі „Гайнаўка" прынялі ўдзел вакалісты розных нацыянальнасцей і розных канфесій. Было гэта сапраўднае экуменічнае свята малітоўнай песні, сапраўдны экуменізм, за які з вялікім *дерзновеніемъ* моляцца ў канцы кожнага студзеня і нашы іерархі *съ сослужители*.

Пагромы за праўду ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Дзень 18 траўня 2010 года ўвойдзе ў найноўшую гісторыю Беларусі як дзень татальных пагромаў. Каля пяцідзесяці грамадскіх актывістаў прыблізна ў адзін час у некалькіх гарадах зазналі сапраўдную „зачыстку". Затрыманні, вышукі і канфіскацыі — вось прыблізны сцэнарый спецслужбаў дзяржавы, якая ўгледзела ў маленькім грамадскім руху вялікую пагрозу сабе. Аб'ектам такой масіраванай атакі сталі ўдзельнікі кампаніі „Гавары праўду", якая стартавала колькі месяцаў таму. Кампанія досыць звычайная, якіх былі ўжо дзесяткі.

2011 - Перапіс насельніцтва ☞ 4

Ілона КАРПЮК

Толькі да канца траўня будзе працягвацца пробны перапіс насельніцтва ў Польшчы. На Падляшшы ахоплены ім жыхары Сямятыч. Вынікі прадставім на старонках „Нівы". Цяпер пачнем гутаркі наконт сітуацыі беларусаў у Польшчы, асабліва ў кантэксце перапісу 2011 года. Гасцямі „Нівы" з'яўляюцца беларускі гісторык **прафесар Алег Латышонак** ды пасол Сейма Рэчы Паспалітай **Яўген Чыквін**.

Кафедра беларускай культуры
Філалагічны факультэт
Універсітэта ў Беластоку

запрашае на

Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый

27 мая 2010
праф. Валянціна Новак
„Сямейная абраднасць Палесся"
17.00, вул. Лінярскага 3, зала 1Б

9 770546 196000

Пагромы за праўду

Дзень 18 траўня 2010 года ўвойдзе ў найноўшую гісторыю Беларусі як дзень татальных пагромаў. Каля пяцідзесяці грамадскіх актывістаў прыблізна ў адзін час у некалькіх гарадах зазналі сапраўдную „зачыстку". Затрыманні, вышукі і канфіскацыі — вось прыблізны сцэнарый спецслужбаў дзяржавы, якая ўгледзела ў маленькім грамадскім руху вялікую пагрозу сабе. Аб'ектам такой масіраванай атакі сталі ўдзельнікі кампаніі „Гавары праўду", якая стартавала колькі месяцаў таму. Кампанія досыць звычайная, якіх былі ўжо дзесяткі. І тым не менш такі брутальны наступ сілавых структур. Асноўная версія прычын такіх паводзін — нібыта грошы на кампанію, якую ўзначаліў вядомы паэт Уладзімір Някляеў, прыйшлі з Расіі. А ўлада панічна баіцца, калі Масква пачынае шукаць у Беларусі іншых сяброў, асабліва напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў. Старшыня Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны Алег Трусаў на гэты конт нават катэгарычна выказаўся, што ў кампаніі „Гавары праўду" выразна тырчаць „расійскія вушы" і рашуча адхрысціўся ад такіх грамадскіх кампаній на той падставе, што матэрыялы для распаўсюду былі надрукаваны на рускай мове. У апошнім з шаноўным Алегам Трусавым, з якім даводзілася раней шмат дыскутаваць на іншых пляцоўках і па іншых пытаннях, магу абсалютна пагадзіцца. А вось тое, што ён зрабіў такую заяву на другі дзень пасля вышукаў, гонару яму не робіць. Некарэктна гэта і нават непрыгожа! Тыя, хто хоць раз перажыў падобны ператрус, мяне зразумеюць. Што ўяўляюць у Беларусі такія вышукі? Да цябе дахаты (у лепшым разе на працу, а ў горшым і туды, і туды) урываецца „група захопу" ў цывільным, паказваюць ордэр на вышук і пачынаюць цягам трох-чатырох гадзін ператрасаць твае асабістыя рэчы. Камп'ютары не праглядваюць, іх адразу забіраюць. І ў лепшым разе перапісваюць серыйны нумар і апячатваюць працэсар у адмысловы цэлафанавы пакет, а ў горшым вывозяць без сантыментаў на выкананне хоць бы фармальных правілаў. Прытым могуць забраць і манітор, і клавіятуру, хоць яны не з'яўляюцца ўвогуле носьбітамі інфармацыі. Тое, што камп'ютар можа быць не ваш, а вашага дзіцяці, нікога не хвалюе. Пры такіх вышуках, якія праводзіць „доблесны" КГБ ці, прыкладам, АБЭЗ (аддзел барацьбы супраць эканамічнай злачыннасці), як у апошнім выпадку, забіраюцца і іншыя рэчы, якія нават тэарэтычна не могуць быць прыналежныя да штучна прыцягнутай крымінальнай справы. Такімі прадметамі з'яўляюцца не толькі мабільныя тэлефоны і флэшкі, але і абсалютна нейтральныя кніжкі, дыскі, відэакасеты, літаратурныя рукапісы...

У дзень пагромаў 18 траўня забралі нават так званы Чарнобыльскі звон, які штогод выносіўся вясной на вулічную дэманстрацыю. І паўстае амаль рытарычнае пытанне, як у аднайменным апавяданні Льва Талстога: „За што?". За што пераследуюць адных і навошта нацкоўваюць як гончых сабак іншых. За распаўсюд звычайных просценькіх паштовак, на якіх усяго толькі і было напісана „Гавары праўду!"? Калі „всевидящее око" дзяржавы сапраўды разгледзела ў гэтай акцыі контррэвалюцыйны пераварот, то вазьміце і абвесціце гэта афіцыйна, заявіце, што вось яна — пагроза нашаму суверэнітэту, якая прыйшла з усходу. Раскрыйце ўрэшце арганізатараў „антыдзяржаўнай змовы" і рэальны стан рэчаў! Дык не ж — ператрусы праводзіліся нібыта ў сувязі з нейкімі гандлёвымі махінацыямі, паводле абсурднага ў кантэксце грамадскай кампаніі крымінальнага артыкула „распаўсюд ілжывай інфармацыі пра тавары і паслугі". Якія тавары, якія паслугі, ніхто так і не зразумеў. Проста ўсё ў гэтай дзяржаве замешана на хлусні і няпраўдзе. Проста ўсё фальшыва і перакручана, перакулена з ног на галаву, даведзена да абсурду.

І яшчэ раз стала зразумела як улада падзяліла адзін народ на два, паводле якіх крытэрыяў адны залічаны да „правільных" і „чэсных", а іншыя — да „няправільных" і „нячэсных". Як і зразумела, які сцэнарый прыгатаваны для грамадска-палітычных актывістаў у бліжэйшы час. Каб для ўсіх стала відавочна паводле новага анекдатычнага выслоўя: „Радзіму і прэзідэнта не выбіраюць".

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Захавальнік спадчыны продкаў

Канстанціна Майсеню ўспамінае Міхась ВІШАНКА, які ў 1961-1990 гг. працаваў інструктарам Галоўнага праўлення БГКТ.

Помню, як у 1960-х гадах на адным з пленарных пасяджэнняў Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку ўзнікла ідэя сарганізаваць на тэрыторыі Беласточчыны беларускі музей. Ініцыятыва выйшла ад дзеячаў з Гайнаўкі, а галоўным яе аўтарам быў Канстацін Майсеня. Тады я і пазнаёміўся з ім.

Першы беларускі музей арганізавалі мы ў Белавежы. Там атрымалі мы будынак, пры рамонце якога на грамадскіх пачатках памагалі ўсе працаўнікі БГКТ. Кастусь Майсеня памагаў пры рамонце фарбамі, транспартам і сваёй фізічнай працай.

Паралельна вялася праца з насельніцтвам па збіранні экспанатаў для музея. У гэтую акцыю вельмі шырока ўключыўся актыў БГКТ, школьная і ліцэйская моладзь. Помню такое здарэнне. Знайшоў я ў Мікулічах у Трафіма Такаюка драўляны воз. Гаспадар ахвяраваў яго музею і мы з сябрамі цягнулі самі гэты воз аж у Мілейчычы. Пасля Майсеня прыехаў і перавёз яго ў Белавежу.

Этнаграфічны музей у Белавежы карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод турыстаў, якія прыязджалі сюды не толькі з краіны, але і з замежжа. А мы ў сваю чаргу стараліся ўзбагачваць музейны фонд новымі экспанатамі. Але радасць ад музея была кароткай. Некалькі гадоў пазней ваяводскія ўлады загадалі прыпыніць дзейнасць. Беларускі этнаграфічны музей у Белавежы закрылі, а экспанаты перадалі ў Сельскагаспадарчы музей у Цеханоўцы.

Ліквідацыю музея беларускія дзеячы і ахвяравальнікі экспанатаў успрынялі з вялікім жалем і крыўдай. Арганізуючы музей мы спадзяваліся на падтрымку павятовых і ваяводскіх улад, але пазней улады паказалі сваю абыякавасць да праблемаў беларускай нацыянальнай меншасці, да яе культуры.

Аднак ад ідэі будовы музея дзеячы не адмовіліся. Выплыла яна на хвалі палітычных перамен на зломе 1970/1980-х гадоў. Тады ў Гайнаўцы заснаваўся Грамадскі камітэт пабудовы беларускага музея, старшынёю якога стаў Канстанцін Майсеня. Камітэт пачаў хадайнічаць перад уладамі аб атрыманні згоды на свой будынак. І ўлады такі дазвол далі. Спачатку на музейныя мэты перадалі стары фабрычны цэх, пазней дазволілі дабудаваць да яго новыя будынкі. І ад таго часу ўсімі будаўнічымі справамі займаўся Канстанцін Майсеня. Усе дзеячы дружна ўключыліся ў акцыю здабывання фінансавых сродкаў на будову музея. Прадавалі мы г.зв. цаглінкі, а атрыманыя грошы перадавалі Грамадскаму камітэту пабудовы беларускага музея. Вялікая дапамога паступала ад прадпрыемстваў і шматлікіх устаноў, прафсаюзаў, кааператываў, маладзёжных і грамадскіх арганізацый, ад насельніцтва.

Помню, што была вялікая падтрымка з боку беларусаў з Захаду (ЗША, Канада, Аўстралія) і з Савецкай Беларусі.

Усімі справамі звязанымі з будовай музея найбольш займаўся Канстанцін Майсеня. Ён вельмі часта выязджаў у Беларусь і адтуль ніколі не вяртаўся з пустымі рукамі. Час ішоў, а музейныя будынкі раслі ў вачах. Прыйшоў час адкрыць музей і даць яму новае дыханне, якога мы так доўга чакалі. Зноў пачалі мы збіраць экспанаты. Я сам асабіста і беларускі актыў у раёне майго дзеяння ўнеслі вялікі ўклад у музейную скарбонку. Абышлі мы ўсе панадворкі, заглядалі на гарышчы, у свірны і клуні і выцягнулі адтуль шмат старых прылад для апрацоўкі зямлі, прадметаў хатняга ўжытку. Сабраныя экспанаты мелі вялікую музейную вартасць, напрыклад, жорны, якім было больш за сто гадоў.

Час ішоў, нарадзілася думка, каб у будынку музея адкрыць цэнтр беларускай культуры, аб чым ад самога пачатку марыў наш нястомны захавальнік спадчыны продкаў Канстанцін Майсеня. На маю думку, на пляцы музея трэба стварыць скансэн з царквой, хатай і іншымі характэрнымі беларусам пабудовамі, якія сведчылі б аб нашай тоеснасці. А на музейным будынку неабходна аднавіць беларускі арнамент і ўстанавіць табліцу ў гонар тых, хто ўнёс уклад у будову музея. Прапаную прысвоіць музею імя яго будаўніка, Канстанціна Майсені, які так шчыра будаваў яго, стараўся, ездзіў па вёсках у пошуках экспанатаў, сарганізаваў першыя музейныя выставы.

Запісаў Віктар БУРА

Вачыма еўрапейца

Медыйная ўсмешка

Прэзідэнцкая кампанія ў Польшчы ідзе поўным ходам. Па прычыне трагедыі пад Смаленскам і паводкі праходзіць яна інакш ад усіх выбарчых гонак, якія адбываліся да гэтай пары. Таму па прычыне сур'ёзнасці гэтай асаблівай сітуацыі з увагай назіраю за паводзінамі палітыкаў, а таксама каментатараў палітычнага жыцця, між іншым сябрыны журналістаў. Амаль кожны з кандыдатаў, але таксама і каментатараў, што і руш патрабуе праграмнай дэбаты. Кандыдаты папракаюць адзін аднаго ў недахопе ўявы будучай Польшчы. І маюць рацыю. Хоць агульна ведаю, чаго ад самых сур'ёзных з іх (калі прымаць пад увагу даследаванні публічнай думкі) спадзявацца, дык ахвотна пачуў бы, што яны прапануюць на найбліжэйшыя гады, збіраючыся ў Прэзідэнцкі палац. З другога боку, назіраю за імі ў публічным жыцці здаўна і крыху ведаю аб тым, што яны думаюць, якія яны ёсць, якія сілы стаяць за імі. Ведаю таксама, якія канстытуцыйныя правамоцтвы і кампетэнцыі ў прэзідэнта. Ды якраз таму добра было б пачуць, ці паасобныя кандыдаты будуць ахвотна карыстацца, напрыклад, правам правядзення рэферэндуму і ў якіх магчымых пытаннях было б гэта неабходным, якія законы хацелі б унесці ў парламент, у якой сітуацыі пакарысталіся б правам на пасланне ў Сейм, Сенат ці абедзве палаты, якую маюць уяву замежнай і абарончай палітыкі, якую ролю ў дзяржаве павінен мець старшыня Нацыянальнага польскага банка, якога прэзідэнт назначае. На жаль, як дагэтуль мала даведаўся я ад патэнцыяльных кіраўнікоў дзяржавы, прынамсі калі гаворка пра адназначныя дэкларацыі.

У гэтых справах таксама журналісты здаюцца мне маладапытлівымі. Я зусім ужо здурнеў, калі адна з — здавалася б — самых сур'ёзных тэлестанцый узялася за „незвычайна важную" давыбарчую тэму зубоў кандыдатаў. А гэта па прычыне адной пані стаматолаг з Катавіц. Вось яна заявіла, што толькі ў трох з дзесяці кандыдатаў „медыйная ўсмешка", якая „не толькі амалоджвае, але і з'ядноўвае прыхільнасць выбаршчыкаў". А астатнія „практычна ўвогуле публічна не ўсміхаюцца", і, самае горшае: „патрабуюць неадкладнай дапамогі артадонта ці пратэтыка" (мабыць, катавіцкая стаматолаг такім чынам хацела запрапанаваць сваю дапамогу?).

— Калі б большасць палітыкаў з цяперашняга выбарчага спіска стартавала ў выбарах у Белы дом, прапалі б яшчэ ў элімінацыйных гонках. Не з-за выбарчай праграмы, а з-за здаровай і гарманічнай усмешкі, — паставіла тэзіс зубны ўрач.

У яе ацэнцы найбольш „медыйная ўсмешка" ў Багуслава Зентка, Браніслава Камароўскага і Анджэя Лепера. Няблага таксама, на яе думку, атрымліваецца ў Гжэгажа Напяральскага, толькі пры засцярозе, што „ў яго ёсць прастрэліны паміж зубамі".

— Найчасцейшай праблемай, відавочнай у палітыкаў, з'яўляецца недахоп малых карэнных зубоў. Відаць гэтую хібу нават на здымку ў профіль. Іншая праблема, таксама частая — колер зубоў. У большасці кандыдатаў зубы зжоўклыя ад кавы, цыгарэт і каляровых страў [адносна такіх страў я ў несвядомасці — М. Х.].

Прачытаў я гэты стаматалагічны аналіз, раскрыў рот спаглядаючы ў люстра і падумаў сабе, што я спакойна мог бы станавіцца ў прэзідэнцкія спаборніцтвы. Я жадаў бы мець лепшым стан маіх зубоў. Засталося б мне толькі так, як цяперашнім кандыдатам, неяк укусіць выбарчую праграму. Ды што там праграма, калі аказваецца, што самая важная — „медыйная ўсмешка"!

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Юбілей паэта і даследчыка

Віншаванні ад калег-белавежцаў

Прафесару Яну Чыквіну, родам з Дубіч-Царкоўных, народжанаму 18 мая 1940 года, Універсітэт у Беластоку сарганізаваў урачыстае мерапрыемства, прымеркаванае да юбілею сямідзесяцігоддзя з дня нараджэння ды саракагоддзя навуковай працы. Вядомы паэт, гісторык беларускай і рускай літаратур, перакладчык, доктар гуманітарных навук, прафесар, грамадскі дзеяч і выдавец скончыў русістыку ў Варшаўскім універсітэце ў 1964 г. Ад 1969 г. з'яўляўся навуковым супрацоўнікам філіі Варшаўскага ўніверсітэта ў Беластоку, у 1985-1997 гг. — Варшаўскага ўніверсітэта, ад 1998 г. — Універсітэта ў Беластоку. З 1969 г. ён — член Польскага таварыства русістаў, з 1970 г. — Саюза польскіх пісьменнікаў, з 1991 г. — Міжнароднае асацыяцыі беларусістаў, з 1996 г. — беларускага ПЭН-цэнтра. Ад 1989 г. ён — страшыня Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа", ад 1990 г. — рэдактар выдавецкай серыі „Бібліятэка Беларускага літаратурнага аб'яднання «Белавежа»", ад 1998 г. — літаратурна-крытычанага часопіса „Тэрмапілы". Ян Чыквін з'яўляецца членам Міжнароднай праграмнай рады часопіса „Всемирная литература", Праграмнай рады навукова-метадычнага зборніка „Беларускае літаратуразнаўства", рэдкалегіі „Acta Polono-Ruthenica", рэдкалегіі „Studia Wschodniosłowiańskie". Ён — аўтар больш за 200 навуковых артыкулаў, апублікаваў кнігі *Afanasij Fet. Studium historycznoliterackie* (Białystok 1984), *Далёкія і блізкія. Беларускія пісьменнікі замежжа* (Беласток 1997), *Беларуская літаратура Польшчы. Бібліяграфічны даведнік. 1957-1998* (Беласток 1998), *Polskie białorutenika literackie. Bibliografia przedmiotowa. 1945-1998,* у супрацоўніцтве з Гражынай Харытанюк (Białystok 1998), *Па прызванні і абавязку. Літаратурна-крытычныя артыкулы* (Беласток 2005). Ён — укладальнік анталогій: *Antologia poezji rosyjskiej. 1840-1895* (Warszawa 1984), *Беларускія пісьменнікі Польшчы. Другая палова XX стагоддзя* (Мінск 2000), *Беларускае літаратурнае аб'яднанне „Белавежа". 1958-2003 гг. у фатаграфіі* (Беласток 2003), *Шлях па прамой часу. Да гісторыі беларускай літаратуры ў Польшчы 1958-2008* (Беласток 2007), дванаццаці паэтычных кніг на беларускай мове *Іду* (Беласток 1969), *Святая студня* (Беласток 1970), *Неспакой* (Беласток 1977), *Светлы міг* (Мінск 1989), *Кругавая чара* (Беласток 1992), *Свет першы і апошні* (Беласток 1997), *Крэйдавае кола* (Беласток 2002), *Жменя пяску* (Беласток 2008), *Адно жыццё* (Беласток 2009); у перакладзе на польскую мову выйшлі кнігі паэзіі: *Na progu światła* (Warszawa 1983), *Splot słoneczny* (Olsztyn 1988), *Odpoczynek przy wyschniętym źródle* (Białystok 1996). Даследчыцкія зацікаўленні Яна Чыквіна: руская літаратура XIX стагоддзя, асабліва плынь „чыстай паэзіі", XIX-вечная руская паэзія і еўрапейская культура, літаратура беларускай эміграцыі, беларуская літаратура XX стагоддзя — традыцыі і наватарства. Вёў даклады з гісторыі рускай літаратуры XIX стагоддзя, з гісторыі сучаснай беларускай літаратуры, манаграфічныя даклады з асаблівым абмеркаваннем марфалогіі свету мастацтва, тэорыі і гісторыі рускага і беларускага верша, а таксама магістэрскія семінары з рускай і беларускай літаратуры. З'яўляецца прамотарам двух доктараў. Узнагароджаны Саюзам польскіх пісьменнікаў медалём імя Ігнацы Красіцкага, а ў 2008 г. міністрам культуры і нацыянальнай спадчыны РП — залатым медалём „Gloria Artis" за ўклад у польскую культуру. Сёння атрымае медаль Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у знак прызнання за ўклад у развіццё беларускай культуры.

На святкаванне юбілею аднаго з першых прафесараў, які стаяў ля вытокаў пераўтварэння філіі Варшаўскага ўніверсітэта ва Універстэт у Беластоку, прыбылі ўлады і супрацоўнікі ўсіх факультэтаў беластоцкай вучэльні, іх студэнты, прадстаўнікі Гродзенскага і Брэсцкага ўніверсітэтаў, дыпламаты Рэспублікі Беларусь, сябры літаратурнага аб'яднання „Белавежа". Сустрэчу вяла цяперашні кіраўнік кафедры рускай даўняй літаратуры прафесар Ванда Супа, якой навуковы дослед кранае таксама дасягненні сучаснай беларускай літаратуры Беласточчыны.

— Гэтая сустрэча з'яўляецца таксама падагульненнем энергіі і моцы творчасці гэтага таленавітага чалавека, які рэалізаваў сябе самога і рэалізуе, памнажаючы нашы супольныя каштоўнасці, — у сваім віншавальным слове выказаўся на тэму асобы юбіляра рэктар Універсітэта ў Беластоку прафесар Ежы Нікітаровіч. — Гэта свята ўсяе беластоцкай акадэмічнай грамады. Твае веды, працавітасць, талент і аўтарытэт унеслі вялікі ўклад у існаванне нашага ўніверсітэта.

Рэктар Ежы Нікітаровіч уручае Юбіляру памятную кнігу

Віншавальныя словы перадалі пасольства Рэспублікі Беларусь, кіраўніцтва Культурнага цэнтра Беларусі, калегі з Гродзенскага і Брэсцкага ўніверсітэтаў, Саюза польскіх пісьменнікаў. Часам віншавальныя лісты мелі выгляд адмысловых вершаў, як ляўдацыі Яна Леанчука, Алы Петрушкевіч ці белавежскай сябрыны. Студэнты рускай філалогіі падрыхтавалі дэкламацыю твораў Юбіляра на польскай і беларускай мовах. Прэзентавалася як падарунак Памятная кніга Юбіляру ў выглядзе абшырнага і выдатна выдадзенага збору артыкулаў калег-навукоўцаў з нагоды юбілею. Пералік дасягненняў юбіляра і ягоных прыкладных рыс характару як чалавека і даследчыка, успаміны з акадэмічнага і жыццёвага быту некароткага жыцця працягваліся б яшчэ і яшчэ ў актавым зале будынка Філалагічна-гістарычна-сацыялагічнага факультэтаў, перад дзвярыма якога можна было пазнаёміцца з выбарам кніжных выданняў юбіляра — аўтарскіх і рэдактарскіх.

— Ян Чыквін — адзін з тых, хто стаяў ля вытокаў беларускага адраджэнскага руху ў Польшчы другой паловы XX стагоддзя, — сцвердзіў даследчык з Гродна Анатоль Раманчук. — Яго творчы шлях доўжыцца паралельна з развіццём беларускай літаратуры Беласточчыны і храналагічна палягае ў рэчышчы ўсёй дзейнасці БГКТ і „белавежскага" літаб'яднання. Яго вершы ўяўляюць сабою самабытную паэзію, беларускую па сутнасці, якая разам з тым арганічна далучаецца да агульнаеўрапейскага культуралагічнага кантэксту, развівае інтэлектуальны і філасофскі накірунак у лірыцы. Вызначальныя рысы яго паэзіі — медытатыўнасць, заглыбленасць у сусветны культуралагічны і філасофскі кантэкст, пастаянны зварот да агульначалавечых праблем і „адвечных" тэм, метафарычнасць, гатоўнасць да эксперыменту ў галіне форма- і вобразатворчасці. Трывала замацавана ў ягонай паэтычнай свядомасці нацыянальная ідэя. Феномен Яна Чыквіна тлумачыцца заўсёднай гатоўнасцю да пастаяннага эксперыменту, адкрытасцю новым ідэям, творчай рухомасцю ўсіх кампанентаў стылю і адначасова — фундаментальнай адназначнасцю маральна-філасофскай канцэпцыі, што абапіраецца на высокія ідэі служэння мастацтву, Айчыне, чалавецтву.

Жадаем Юбіляру далейшай плённай працы ў здароўі і натхненні ды шчасці!

Нараўчанская гміна

Радныя цікавяцца „Нівай"

Пяць асоб: Тамара Барэчка з Гайнаўкі, Мікалай Скепка, Аляксандр Скепка, Сяргей Целушэцкі і Раман Паскробка з Новага Ляўкова — новыя чытачы „Нівы", якія пачалі гартаць яе старонкі з васемнаццатага нумара (ён ад 2 мая 2010 г.). Родны часопіс № 18 дакладна прачытала сужонства Яўгенія і Юрка Равінскія са Старога Ляўкова — у гэтым нумары друкаваліся ўспаміны з вайны Любы Пташынскай, маці Яўгеніі Равінскай, пад загалоўкам „Усё пралятала над нашымі галовамі". Гэтыя ўспаміны з хваляваннем чытала таксама другая дачка Любы Пташынскай — Ала Станько, якая жыве ў Ласінцы Нарваўскай гміны.

18-ты нумар „Нівы" пераглянулі і прачыталі таксама Мікалай Янкоўскі з Гайнаўкі, Галіна і Юрка Казлоўскія, Люба Скепка, Лідзія і Аляксандр Казлоўскія ды Лідзія Галубоўская (а таксам яе суседзі) з Новага Ляўкова. У гэтым нумары былі звесткі з Новага і Старога Ляўкова.

„Ніву" № 19 чыталі, як мне добра вядома, прынамсі дзевятнаццаць чалавек. Гэты нумар чытала Вера Шыкула з Гайнаўкі (яна ўраджэнка Новага Ляўкова). Яна новая чытачка беластоцкай беларускай газеты. Са Старога Ляўкова гэты нумар „Нівы" чыталі Ян і Марыя Русіновічы, Ніна Бандарук і Міраслава Балтрамюк, з Белавежы: Марыя і Раман Валкавыцкія; з Новага Ляўкова: Ян і Марыя Янелі ды Лідзія Грыгарук, а з Плянты: Галіна Бірыцкая і Валянціна Самойлік. Пастаянна чытаюць „Ніву" радныя Нараўчанскай гміны: Івона Пташынская з Лешукоў, Славамір Кулеша і Радаслаў Матысюк з Семяноўкі, Юрка Лукша з Альхоўкі, Ян Сухадола з Тарнопаля, Крыстына Кіслая з Нараўкі, Юрка Дрозд са Скупава, Юрка Равінскі са Старога Ляўкова і Янка Целушэцкі з Новага Ляўкова. У чэрвені г.г. новым чытачом беларускага штотыднёвіка будзе радны Ян Драўноўскі з Міклашэва.

Толькі каб было больш вестак у „Ніве" з Нараўчанскай гміны, але таксама з Гайнаўскай, Белавежскай ці Нарваўскай гмін. І будзе больш чытачоў у Гайнаўскім павеце!

Адказ на ніўскі допіс з крытыкай

6 мая гэта года транспартнае прадпрыемства ПКС у Беластоку выслала адказ на допіс пад загалоўкам „Калі едзе аўтобус ПКС" („Ніва" № 11):

Ze względu na dotychczasową współpracę Przedsiębiorstwo Komunikacji Samochodowej S.A. w Białymstoku uzupełni tabliczki przystankowe w Lewkowie, Plancie, Grodzisku i w Narewce podczas najbliższej akcji uzupełniania informacji rozkładowych. Z poważaniem — kierownik Pionu ds. Przewozów Paweł Krzysztof Gogiel.

Вось тады будзем дакладна ведаць, калі едзе аўтобус ПКС!

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

2011 перапіс насельніцтва

Толькі да канца траўня будзе працягвацца пробны перапіс насельніцтва ў Польшчы. На Падляшшы ахоплены ім жыхары Сямятыч. Вынікі прадставім на старонках „Нівы". Цяпер пачнем гутаркі наконт сітуацыі беларусаў у Польшчы, асабліва ў кантэксце перапісу 2011 года. Гасцямі „Нівы" з'яўляюцца беларускі гісторык ***прафесар Алег Латышонак*** *ды пасол Сейма Рэчы Паспалітай* ***Яўген Чыквін****. Гутарыць Ілона Карпюк*

— Як зараз можна ахарактарызаваць дынаміку беларускай супольнасці ў Польшчы?

Алег Латышонак: — Стагнацыя. У асноўным працягваецца тое, што было калісь, мала новых ініцыятыў. Калі бачу студэнтаў, то здаецца мне, што іх намнога менш удзельнічае ў беларускім жыцці.

— Як тады прамаваць перапіс і беларускасць?

— Большасць даўно вырашыла хто яны. Не трэба весці ніякай акцыі, бо пераканаць можна адзінкі. Немагчыма, што калі хтосьці пабачыць лозунг, то яму вернецца або народзіцца нацыянальнае пачуццё. Тыя, якія ў 2002 годзе запісаліся беларусамі і зараз імі запішуцца, а хто палічыў сябе палякам, ім і застанецца. Няма ніякіх фактараў, якія маглі б выклікаць змены. Павінна быць дынаміка палітычная, а за гэтым і эканамічная, а такога не чакаецца. Пакуль не памяняецца сітуацыя ў Беларусі, у нас таксама нічога не зменіцца. Мы надта малая і слабая супольнасць, каб самастойна рашаць.

— Як можа паўплываць магчымасць выбару двайной тоеснасці?

— Маю дзве інтэрпрэтацыі. Першая — гэта выхад для шызоідаў. Нацыянальнасць гэта ідэйны выбар і можа яна быць толькі адна. Другая — гэта можа быць ціск на тых, якія запісаліся беларусамі, каб яшчэ запісаліся палякамі. Чыста тэарэтычна можа гэта спрацаваць і ў другі бок, нават маю надзею, што так спрацуе, але на памежжы выбар бывае рэзкі. У прыватным жыцці чалавек дазваляе сабе на пераходныя сітуацыі, але пры выбары нацыянальнасці можам чакаць рашучасці. Калісь мой знаёмы сказаў мне: тое, што я паляк, не абазначае, што я не беларус. Гэта пацвярджае, што прыватнае не супадае з вонкавым. А нацыя гэта справа не прыватная, а палітычная і ідэалагічная. Хто думае інакш, не мае рацыі.

— Якое значэнне будзе мець у перапісе пытанне пра веравызнанне?

— Цешуся, што гэтае пытанне будзе. Пакажа, якая ёсць сфера паміж беларусамі і палякамі, менавіта колькі ёсць людзей, якія лічаць сябе праваслаўнымі палякамі. Падзел у нас рэлігійны. Для палякаў чужыя не толькі беларусы, але ўсе праваслаўныя, як бы яны не былі шчыра перакананыя ў сваёй польскасці. Нацыянальнасць у нас менш важная, чым рэлігійны падзел. У выпадку беларусаў на рэлігійнае накладаецца нацыянальнае і гэта паглыбляе адчужанасць. Але ў гэтым кантэксце не пагаджуся, што людзей дзеляць палітыкі. Гэта народ не думае рацыянальна. Эліты прымушаны думаць у катэгорыях таго, што аплачваецца ці не аплачваецца, а народ — эмацыянальны.

http://blog.inf.by

— Колькі нас будзе?

— Напэўна менш. Я бачыў вашы падлікі жыхароў на Падляшшы. Столькі ж людзей памерла.

Фота Ілоны КАРПЮК

— Ад чаго будуць залежаць вынікі перапісу?

Яўген Чыквін: — У асноўным ад свядомасці людзей. Калі будуць добра паінфармаваны і будуць адчуваць у сэрцы, што яны беларусы, што маюць сваю мову, то і запішуцца беларусамі, а калі будуць казаць, што ў нас свая мова, нашая, мы свае людзі і г.д., то трэба зразумець, што перапісчыкі, карыстаючыся інструкцыяй, не будуць маглі пісаць рэчаў, якія не прадбачаны анкетай. Другая справа гэта падрыхтоўка саміх перапісчыкаў і іх падыход да людзей. Не хочам, каб былі такія сітуацыі як у 2002 годзе. Сам добра ведаю, бо майго роднага брата ў Бельску не запыталі пра нацыянальнасць. Калі жанчына ўжо пайшла, ён узгадаў, што пытання не было і падумаў, што можа гэта нейкая правакацыя і хтосьці пасля выцягне, што брат беларускага пасла не прызнаецца да сваёй нацыянальнасці.

— Ці цяжэй будзе адказаць на пытанне пра нацыянальнасць ці веравызнанне?

— Напэўна пра нацыянальнасць, хаця рэлігія мае вялікае значэнне ў фармаванні беларускай тоеснасці. Мы ўжо заказалі пару экспертыз наконт значэння рэлігіі для ўсходніх славян, ужо ёсць крыху даследаванняў. Для беларусаў рэлігія мае такое ж значэнне як для жыдоў, таму і адказаць будзе лягчэй. Трэба памятаць, што нават шмат з тых, якія ў царкву не ходзяць, называюць сябе праваслаўнымі, таму нават парадаксальнае выказванне Лукашэнкі, што ён праваслаўны атэіст не з'яўляецца для нас так абсурдным. Самай важнай праблемай застаецца аднак той страх, які мая жонка акрэсліла ў сваёй габілітацыйнай дысертацыі стыгматам, адмоўным назначэннем (Альжбета Чыквін, „Беларуская нацыянальная меншасць як стыгматызаваная група" — рэд.). Я помню, калі сустракаўся з людзьмі перад папярэднім перапісам і пераконваў, што няма чаго баяцца ці саромецца, то мне адказвалі: вы — малады, не помніце, што тут адбывалася.

— А як Вы ставіцеся да магчымасці двайнога выбару?

— Мы гэтую патрэбу выносілі на пасяджэнне сеймавай камісіі, бо зараз практычна ўсе меншасці гатовы дэкларавацъ двайную тоеснасць, асабліва гэта назіраецца на Сілезіі, дзе рэгулярна кажуць пра сябе сілезец-паляк. Такая магчымасць была б бліжэй рэчаіснасці. Наша прывязанасць да беларускай дзяржаўнасці амаль ніякая, мы прывязаны да Польшчы, а людзі яшчэ часта блытаюць грамадзянства з нацыянальнасцю, але калі будуць маглі сказаць: я — паляк беларускага паходжання, то пакарыстаюцца гэтай магчымасцю.

— Паводле некаторых нашых дзеячаў і даследчыкаў немагчыма быць і палякам, і беларусам.

— Думаю, можна быць палякам беларускага паходжання, як і амерыканцам польскага паходжання. Гэта складанае пытанне, але трэба перш за ўсё мець пашану для таго, што думаюць людзі. Не можна ім казаць, што яны непаўнацэнныя, так як калісь мне казалі: які ты беларус, калі літаратурнай мовы не ведаеш. Павінен ведаць, я згодны, але не вывучаў у школе, то і не ведаю. Так рэзка не можам аднак ставіцца да людзей, з якіх многія маюць у сабе страх, бо што ж мы можам думаць, калі я яшчэ ў мінулым годзе зайшоў у Інстытут нацыянальнай памяці і бачу партрэт Рамуальда Райса „Бурага", які гэтым самым аддзелам Інстытута ўжо быў прызнаны злачынцам. У малодшым пакаленні гэтага можа і няма, але ў старэйшых людзей такая дыстанцыя захоўваецца.

— Ці патрэбная прамоцыя перапісу?

— Напэўна. І буду гэта рабіць непасрэдна ды на старонках „Праваслаўнага агляду". Тут перш за ўсё трэба тлумачыць, што грамадзянства гэта не нацыянальнасць. Запісацца беларусам гэта не здрада ці нейкая нелаяльнасць, бо гэта розныя справы. А нацыянальная разнастайнасць часта дзяржаве патрэбная. Напэўна аднак не буду так радыкальна ставіцца як іншыя „альбо-альбо", бо будзе беларусаў менш і менш, бо нават калі хтосьці будзе дэкларавацъ сябе і беларусам, і палякам можа адбудаваць сваю нацыянальную беларускую тоеснасць.

— Ці без сумненняў падпішаце лістоўку ці зварот да людзей з лозунгам „Запішыся беларусам"?

— Так. Гэтае і апошнім разам мы рабілі. Хаця я быў поўны боязі пасля сустрэч з людзьмі, якія перажылі ваенную траўму. Аднак аказалася, што знайшліся свядомыя і адказныя людзі, карыстаюцца яны магчымасцямі, якія дае закон аб нацыянальных меншасцях, уводзяць дапаможную мову, будуць двухмоўныя ўказальнікі.

— Колькі будзе беларусаў пасля перапісу 2011 года?

— Спадзяюся, што будзе больш, нязначна, але ўсё ж такі больш.

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Усё залежыць ад Беларусі

Польскі Сейм у мінулым тыдні на пленарным пасяджэнні аднагалосна ратыфікаваў праект дамовы аб малым памежным руху (МПР) з Беларуссю (галасавала 388 дэпутатаў з 460). Пасля рэкордна хуткіх, бо працягваючыхся два дні чытаннях, і галасаванні ў Сенаце трапіць яна да прэзідэнта, які мае яе падпісаць „неадкладна". Дамова магла б увайсці ў сілу ўжо ў ліпені, значыць, трыццаць дзён пасля падпісання яе прэзідэнтам, аднак усё паказвае на тое, што беларускі бок не спяшаецца з ратыфікацыйным працэсам.

Згодна з меркаваннямі польскага МЗС, праўдападобна асобы пражываючыя ўздоўж польска-беларускай мяжы пакарыстаюцца палёгкамі толькі ад 2011 года.

— Цяпер усё будзе залежаць ад беларусаў. З нашага боку магчымае завяршэнне ўсяго працэсу звязанага з уступленнем у сілу дамовы ад ліпеня, значыць, у канікулы могуць выдавацца ўжо дазволы на перасяканне мяжы ў рамках МПР, — сказаў у размове з „Нівай" падляшскі дэпутат Роберт Тышкевіч, віцэ-старшыня сеймавай камісіі замежных спраў і старшыня парламенцкай групы па справах Беларусі пасля супольнага пасяджэння камісій замежных і ўнутраных спраў. — Наш урад, аднак, атрымаў сігналы з пасольства Беларусі ў Варшаве, што ў першым паўгоддзі беларускі парламент не прадбачыў ратыфікацыі гэтага праекта.

Аляксей Зелянко, прэс-сакратар пасольства Беларусі ў Польшчы, заявіў са свайго боку:

— Гэтая дамова ў Беларусі яшчэ на ўзроўні міжведамасных пагадненняў. Аб дэталях просім даведвацца ў нашым МЗС. Адпаведную заяву можна знайсці на вэб-старонках Радыё Рацыя.

Фактычна загадчык аддзела па забеспячэнню дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і сувязях з СНД Аляксандр Капцэвіч заявіў у размове з гэтай радыёстанцыяй:

— Няма ў нас такога праекта і з таго, што ведаю, няма яго таксам ва ўрадзе. Спыніўся ён на ўзроўні МЗС. Калі праект не будзе пададзены на цяперашнюю сесію, якая кончыцца 30 чэрвеня, мабыць трапіць на асеннюю.

Выконваючы абавязкі прэзідэнта маршалак Браніслаў Камароўскі прадбачыў падпісанне адразу пасля таго, калі дамова выйдзе з парламента. Асабіста прыкладвае ён асаблівую ўвагу да гэтага праекта. Гаварыў аб гэтым таксама дзеля таго, каб выслаць выразны сігнал беларускаму боку. Так вось будзем чакаць беларускага боку. Лічым, што хутка зоймецца ён гэтай дамовай згодна са сваімі палітычнымі дэкларацыямі. Гэта справа добрай волі.

Незалежна ад таго, што ў планах вясенняй сесіі беларускага парламента не было пункта датычнага ратыфікацыі дамовы аб МПР (насуперак таму, што больш месяца таму гаварыў „Ніве" генконсул РБ у Беластоку Міхал Аляксейчык; у апошні час ён у водпуску), можа ён быць пададзены, хоць бы пасля інтэрвенцыі прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Паявіліся, аднак, сумненні, што, мабыць, беларускі бок схоча штосьці змяніць у дамове падпісанай у Варшаве 12 лютага кіраўнікамі знешнепалітычных ведамстваў Польшчы Радаславам Сікорскім і Беларусі Сяргеем Мартынавым.

— У дыпламатычнай практыцы пасля адабрэння такой дамовы Еўрапейскай камісіяй і падпісання яе міністрамі замежных спраў, няма магчымасці змен, — сцвярджае дэпутат Роберт Тышкевіч.

Падляшская часць Памежнай аховы ўжо ўвяла на прыгранічныя дарогі г.зв. шэнгенбусы для кантролю аўтамашын і людзей на тэрыторыі ахопленай МПР

Неафіцыйна ў апошні час гаварылася таксама, што па прычыне фінансаў могуць быць праблемы з уступленнем дамовы ў сілу.

— Як лагістычна, так арганізацыйна і фінансава мы падрыхтаваны. Грошы забяспечаны. У бюджэце краіны не з'яўляюцца яны вялікімі.

Падляшскі дэпутат ад ПіС Яраслаў Зялінскі, віцэ-старшыня камісіі ўнутраных спраў і адміністрацыі, былы міністр УСіА:

— Не трэба тут спецыяльна забяспечваць сродкаў з бюджэтнага рэзерву. Неабходныя грошы на гэтую мэту ёсць у МЗС і МУСіА. Можна іх пусціць у рух у кожны момант. Ёсць іншая праблема: праблемы могуць быць з беларускага боку, звязаныя з ратыфікацыяй дамовы. Верым, што ўдасца іх пераадолець.

У абгрунтаванні ратыфікаванай польскім Сеймам дамовы з Беларуссю пералічаны дэталёва выдаткі, якія польскі бок будзе несці, ажыццяўляючы МПР. Кошты стварэння новых пасад, значыць, планаванае павелічэнне кадраў консульстваў на восем асоб будзе каштаваць 2 млн. 300 тыс. зл. Рамонты і мадэрнізацыя консульскіх устаноў, між іншым, падрыхтаванне дадатковых акенцаў і пашырэнне памяшканняў прызначаных для абслугі наведвальнікаў пагдынуць 180 тысяч злотых. Гэтыя грошы будзе выдаткаваць МЗС. МУСіА расходуе 300 тысяч на выраб бланкаў дакументаў патрэбных для перасякання мяжы (100 тысяч па 30 злотых). Кошты перабудовы інфармацыйных сістэм гэтае ведамства будзе каштаваць на пагранпераходах у Кузніцы і Баброўніках 60 тыс. зл., а закупка дадатковага сервера з дадатковай матрыцай памяці і праграмамі ды стварэнне і абсталяванне дадатковых чатырох месцаў працы — 752 тыс. зл. Колькі выдасць беларускі бок і ці мае ён забяспечаныя грошы — застаецца таямніцай.

Незалежна ад таго, што ёсць забяспечаныя грошы, клопаты могуць паявіцца, калі гаворка пра неабходнае ў сувязі з ажыццяўленнем МПР павелічэнне кадраў консульстваў у Гродне і Брэсце (у Польшчы беларускія консульствы ў Беластоку і ў Бялай-Падляшскай), якія будуць выдаваць дазволы.

— Павелічэнне кадраў патрабуе згоды беларусаў. Здаўна змагаемся за павелічэнне ліку консульскіх пасад. Калі дамова хутка ўступіць у сілу, выдаванне дазволаў будуць займацца пакуль тыя працаўнікі консульстваў, якія ёсць, — тлумачыць віцэ-старшыня камісіі замежных спраў.

Камандзір Падляшскай часці Памежнай аховы палкоўнік Лешак Чэх, як і начальнік Гродзенскага пагранатрада палкоўнік Ігар Буткевіч гарантавалі „Ніве", што іх часці падрыхтаваныя да ажыццяўлення МПР. Палкоўнік Буткевіч, у час пабыўкі на свяце падляшскіх памежнікаў у Беластоку, сказаў:

— Наша прысутнасць на свяце — гэта найлепшы доказ таму, што нашы адносіны складаюцца вельмі добра. Усе праблемы вырашаем адразу. Я лічу, што так будзе і пасля ўступлення ў сілу дамовы аб МПР. Мы да гэтага падрыхтаваны. А тэрмін уваходу дамовы ў сілу залежыць ад палітыкаў.

Палкоўнік Чэх:

— Працы над увядзеннем МПР у ПЧ ПА працягваюцца ўжо добрыя два гады і мы да гэтага добра падрыхтаваны. Разам з Мытнай палатай будзем ажыццяўляць новую, паскораную сістэму кантролю. Жадаю ў тым кантэксце падляшскаму ваяводу, каб у сувязі з МПР меў больш грошай і будаваў новыя пагранпераходы. Цяпер апасаюся, што часова будуць выстройвацца кароткія чэргі на мяжы. Напэўна трэба завяршыць разбудову пагранпераходу ў Полаўцах-Пяшчатцы. Я бачыў ноту наконт пабудовы пагранпераходу ў Ліпшчанах. Пабудова двух новых, поўнасцю абсталяваных пагранпераходаў на гэтым адрэзку мяжы задаволіла б нас поўнасцю. МПР на пачатку не ахопіць тысяч асоб. Трэба будзе выдаваць дазволы, а гэта, мабыць, працягнецца да канца года. Такі досвед маецца ў нас ужо з украінскай мяжы.

Дырэктар Мытнай палаты ў Беластоку Міраслаў Сянкевіч:

— Яшчэ да ўступлення гэтай дамовы ў сілу мы ўжо засвойваем досвед з польска-ўкраінскай мяжы. Не чакаючы яе, ад 1 мая на пагранпераходах у Кузніцы і Баброўніках абавязваюць г.зв. зялёныя палосы, па якіх могуць перасякаць мяжу асобы, якія не маюць тавараў для абкладання пошлінай. Такія палосы будуць вельмі патрэбныя пры павялічаным памежным руху.

Прыгадаем, што абшар ахоплены дамовай МПР з Беларуссю займае 30 кіламетраў „плюс", значыць, усю тэрыторыю гмін (пасёлкавых і сельскіх саветаў) да 50 км у глыб краіны. Дазволы будуць выдавацца на два, а наступныя на пяць гадоў, цана такога дазволу — 20 еўра. Асобы, якія могуць старацца за такія дазволы на абшары ахопленым МПР, мусяць быць прапісаны прынамсі ад трох гадоў. Звольнены з аплат пенсіянеры, інваліды і дзеці да 18 гадоў. Прытым дазволы будуць даваць права на прабыванне ў суседняй краіне да 30 дзён за адзін раз, але не больш як 90 дзён у час кожных шасці месяцаў лічаных ад дня першага перасячэння мяжы. Што важнае, м.інш. трэба будзе мець з сабою страхавы паліс на сама менш 20 тысяч еўра.

Рускія ў Польшчы

15 красавіка Цэнтр усходніх даследаванняў у Ольштыне наладзіў сустрэчу з Арцёмам Блогавым, які расказаў пра пражываючых у Польшчы рускіх. Руская меншасць у Польшчы налічвае каля пяці тысяч чалавек. Гэта новая хваля эміграцыі, большасць якой прыехала ў Польшчу за навукай і ў рамках кантрактаў. Заснавалі яны згуртаванне Малая Расія, да якога ў Ольштыне належыць 54 членаў.

Самога Блогава запыніла ў Польшчы жанчына. Жыве ён у Ольштыне ўжо дванаццаць гадоў. Здабыў юрыдычную адукацыю і з'яўляецца спецыялістам па расцэнцы нерухомасцей. Паходзіць ён з Таганрога, горада над Азоўскім морам. Калісь цар Пётр I хацеў закласці там сталіцу, але калі ўспыхнула вайна са Швецыяй, паехаў ён на поўнач і там заснаваў Пецярбург. Найслаўнейшым жыхарам Таганрога быў аднак Антон Чэхаў. Захаваўся там ягоны родны дом, школа, у якой вучыўся, тэатр яго імя ды каланіяльная крама, якая з'яўляецца ўласнасцю ягоных сямейнікаў.

Згуртаванне Малая Расія ладзіла ў кастрычніку трохдзённы фестываль савецкага кіно, дзе можна было паглядзець фільмы Вертава і Эйзенштэйна. Думаюць наладзіць таксама фестываль мульцікаў ды канцэрты — не толькі народнай музыкі. Згуртаванне выдае лістоўку на польскай і рускай мовах „Суседзі".

Дакладчык прыгадаў, што жонка расійскага прэм'ера Людміла Пуціна выводзіцца з Калінінграда і пабывала калісь у Ольштыне-Картове ў рамках студэнцкага абмену.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Пра вуліцу ў Бялках

Пісаў я ў „Ніве" некалькі раз пра вуліцу ў Бялках Нарваўскай гміны Гайнаўскага павета. Пішучы крытыку — чакаецца паправы. Дык напішу яшчэ раз. Наша вуліца, калі крышку паліе дождж, становіцца непраходнай багнай. У калдобінах стаіць вада, поўна гразі, і ёсць такія месцы, дзе можна паламаць легкавушку. Аддзел павятовых дарог у Гайнаўцы падвязе сюды пяску, крышку зраўняе, ды гэта нічога не дае: толькі пойдзе дождж, ізноў выбіваюцца калдобіны. Гразь высахне, і як праедзе машына, дык уся вуліца ў пыле, так што не адчыніш акна ці не пасядзіш на лавачцы ля вуліцы.

Тут трэба сказаць, што праз Бялкі праходзіць павятовая дарога, якую чатыры гады ад вёскі Трасцянка (тры з паловай кіламетра) асфальтавалі, ды асфальту не дацягнулі да Бялок. Пачынаюць цяпер асфальтаваць тую дарогу ад вёскі Іванкі ў напрамку Агароднікаў; гэта, мабыць, таму, што солтыс Агароднік, адначасова радны Нарваўскай гміны, настаяў на гэтым. А наша вёска Бялкі — быццам той запаведнік!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

ЮР'Е І ТРОЙЦА ПАД НАРВАЙ

Словы „Жыве яшчэ традыцыя" не пустыя ў Нарваўскай гміне. Іх ажыццяўляюць прыгожыя людзі — маладыя і тыя, пра якіх кажам: маладыя духам — вучні з першага класа ПШ па апошні гімназіі, іх настаўніцы, працаўнікі культурных устаноў гміны. Тут, калі гавораць пра традыцыі, маюць на ўвазе абрады сваіх дзядоў і прадзедаў, напрыклад, святкаванне Юр'я ці Тройцы, якія ў наваколлі Нарвы адзначаюць і па-царкоўнаму, і па-народнаму. На Юр'я ў Ласінцы — прыхадскі фэст і памінанне продкаў. На Тройцу прыпушчанскія жыхары едуць ва ўрочышча Крыначка са святой вадой. Школьнікі з Нарвы, як заўсёды, падрыхтаваліся на пяць з плюсам. Яны

каларытна паказалі абрады на сцэне і ўпрыгожылі іх песнямі і выступленнем музычных калектываў. Наймалодшыя і найстарэйшыя выступоўцы паставілі свае сцэнкі на мясцовым дыялекце і гэта вельмі спадабалася публіцы.

Свята тэатра і песні ўжо чарговы раз наладзілі ў Тыневічах-Вялікіх 15 мая г.г. у будынку былой школы ў рамках культурнага цыкла „Жыве яшчэ традыцыя". У цэнтры падзеі тут дзеці і моладзь, якіх энергія і жыццярадаснасць паднялі на духу састарэлых людзей з Тыневіч-Вялікіх і навакольных вёсак.

ЗОРКА
Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Фестываль культур трэці раз

У Пачатковай школе № 12 у Беластоку, якая носіць імя Зыгмунта Глогера, прайшоў трэці выпуск дзіцячага фестывалю пад лозунгам „Дыялог гэта будаванне ўзаемнасці". Прынялі ў ім удзел маладыя выканаўцы з беластоцкіх і не толькі школ. Сярод запрошаных гасцей былі важныя асобы з кураторыі асветы, улад горада, ваяводства і Рэспублікі Беларусь, а таксама прадстаўнікі палякаў, беларусаў і яўрэяў. Гаспадары вельмі прыгожа афармілі залу, а таксама выступілі не толькі з польскімі творамі. На самым пачатку Губерт Лябда і Ада Бадура дэкламавалі па-беларуску вершы Віктара Шведа. Ансамбль з гэтай школы праспяваў песні на музыку Шапэна, а вучні школы № 16 першы раз прадставілі яўрэйскую культуру — танец і анекдоты. З багатай праграмай выступілі вучні праваслаўнай школы імя Кірылы і Мяфодзія, якія вучацца ў будынку школы імя Глогера. Матэвуш Наумюк, Марыся Сіроцкая, Грышка Зінчук і Юля Кузыка праспявалі сола беларускія песні. Моцную беларускую праграму прадставілі „OrthPower" (іначай „Малыя тутэйшыя") з гэтай школы, якіх рыхтаваў вядомы ўсім музыкант, аўтар музыкі для малечаў Генадзь Шэмет, а таксама калектыў „Казка" з Гарадка. Гарадок разам са сваімі настаўніцамі падрыхтаваў багаты беларускі пачастунак з каравае і паказам традыцыйных беларускіх вырабаў. Дзеці з ПШ № 12 праспявалі таксама пару ўкраінскіх песень. У тым часе ўручаны былі ўзнагароды пераможцам літаратурнага конкурсу на тэму разваг „Горад і рэгіён у Еўрасаюзе" ды лірычнага (перамагла, між іншым, Марта Іванюк з ПШ № 6 з Гайнаўкі), а таксама мастацкага „Мой сябра-чужаземец і яго айчына". На сценах красаваліся прыгожыя малюнкі вучняў з цэлага Падляшша, між іншым, малюнак Ады Бадуры з ПШ № 12, вучаніцы пані Яўгеніі Петрышык.

„Казка" з Гарадка

Заварыжылі ўсіх гледачоў чачэнцы — дзяўчаты і хлопцы, часам зусім маленечкія — сваімі танцамі. Вельмі дастойна і па-мастацку выступілі вучаніца ПШ № 37 Іма Амдошава (вучаніца пані Валі Манаховіч) і моладзь з ансамбля „Ночча", які працуе пры клубе „Кактус" у Беластоку. Чачэнская моладзь тэмпераментна выступіла ў нацыянальных строях са сваімі народнымі танцамі. Майстры і зухі!

Вясёлкавы фестываль будзе мець працяг у наступным годзе.

(лук)

Галерэя дэкламатараў „Роднае слова 2010"

Адрыян Мусевіч

Арыядна Бакер

Агата Максімюк

Максім Фіёнік

З ПАДЛЯШСКАГА СВЕТУ

Скарышэва

Сярод падляшскіх мясцовасцей шмат такіх, якія ў даўнія часы бурлілі жыццём, а сёння засталося ад іх усяго некалькі хацінак.

Такім прыкладам можа быць вёска Скарышэва, што ў Нарваўскай гміне. Але ў гэтым выпадку, апрача багатага мінулага, нават зараз у ёй адбываюцца цікавыя падзеі. Вёска Скарышэва была заснавана ў XVIII ст. на землях, якія належалі да Нарвы. Згодна з архіўнымі царкоўнымі запісамі ў гэты час у мясцовасці пражывалі 34 асобы. Аднак у XIX ст. у выніку эпідэміі халеры колькасць насельніцтва паменшылася да 22 чалавек. Сёння ў гэтай маленькай вёсачцы пражывае ўсяго 15 чалавек.

Варта падкрэсліць, што сёння Скарышэва вядомае дзякуючы аднаму са сваіх жыхароў, а менавіта Міхалу Філяновічу, які ў Скарышэве вядзе беларускі рэгіянальны музей, у якім захоўваюцца дзесяткі, калі не сотні, цікавых экспанатаў.

У яго музеі „Хата" сабраны хатнія і гаспадарчыя прылады, а таксама старыя дакументы, якія датычаць Скарышэва і ваколіц. Цікава, што ўсе экспанаты спадар Філяновіч збіраў сам. У музеі „Хата" ў Скарышэве спадар Філяновіч паказвае таксама старыя беларускія строі з Падляшша, мае таксама экспанаты, якія датычаць духоўнага жыцця нашых продкаў.

Цікава, што экспазіцыя спадара Міхала Філяновіча настолькі вялікая, што не змяшчаецца ўжо ў адным будынку. У крыху іншым месцы гаспадаркі, у клуні, можам пабачыць земляробчыя прылады.

У сваім музеі „Хата" спадар Філяновіч сабраў столькі цікавых экспанатаў, што сапраўды ў вясновы цёплы дзень варта папасці ў маленькае Скарышэва і пабачыць вынікі яго шматгадовай працы.

Міхась СЦЕПАНЮК

Аляксандра Смоліч

Мама

На рынку неяк адбілася ад маткі дзіця, ды блукаецца між народам. Заблудзілася беднае, плача, бегае, шукае маткі. Пытаюць людзі ў яго: «Якая ж твая мама, дзетка?» А яно скрозь слёзы і кажа: «Хіба вы не ведаеце? Мая ж мама за ўсіх дабрэйшая і прыгажэйшая».

Вера Вярба

Матуліны рукі

З маленства яны нас
Да сэрца гарнулі,
Пяшчотныя, добрыя
Рукі матулі,
Што з ранку працуюць
Няспынна і лоўка —
Дачушку накормяць,
Прычэшуць галоўку,
Кашулю пашыюць,
Праверацъ задачу
І сына суцешаць,
Калі той заплача.
Матуліны рукі
Нас цешаць, галубяць,
Так шчыра, як маці,
Ніхто нас не любіць.
Матуліны рукі —
Адзіныя ў свеце,
Шануйце, любіце
Заўсёды іх, дзеці.

Музыка з кайфам

Сезон на Караткевіча

Хаця 2010 год абвешчаны годам Ларысы Геніюш, на восені, дакладна ў лістападзе, мінае 80 гадоў з дня нараджэння вялікага чалавека з „кароткім" прозвішчам. Восемдзесят гадоў, калі глядзець на форму беларускіх мастакоў, пісьменнікаў, не так і шмат, але Уладзіміру Караткевічу не прыйшлося дачакаць такога юбілею ў жывых. Мала такіх людзей, творчасць якіх жыве больш інтэнсіўна, чым яны самі. Напрыклад, Уладзімір Караткевіч — майстар слова, творчасць якога працягвае жыццё і папулярнасць пісьменніка. Фантастычны свет, які стварыў у сваіх радках, гэта лірыка мінулага, кахання, жыцця і чалавека. Не сустрэнеш другіх такіх фраз. Нічога дзіўнага, што ў іх бок звяртаюцца чарговыя паклоннікі. У юбілейны год гукамі першым пачаў папулярызаваць творчасць пісьменніка Зміцер Вайцюшкевіч, прэзентуючы канцэрт твораў на словы Караткевіча. Але памяць пра юбіляра мае ўжо багатую хроніку. На тэксты Уладзіміра Караткевіча складзены цэлы альбом пад загалоўкам „Скрыпка дрыгвы". З'явіўся ён яшчэ ў 2005 годзе, а запісаны на ім, між іншым, Лявон Вольскі, Аляксандр Памідораў, „Нейра Дзюбель" і згаданы Вайцюшкевіч. Калі ўспомніце гайнаўскі гурт „Гоман", то ў сваім рэпертуары меў ён песню „Кастрычнік" на словы Караткевіча. А „Чуфут-Кале" гурту „ZERO-85"? Так, гэта таксама выдатны твор гэтага аўтара.

27 траўня ў рамках Дзён сучаснага мастацтва ў Беластоку танцоры з групы „Grupa Przejściowa" супольна з музыкамі гурту „Ilo&friends" прэзентуюць у беластоцкім лялечным тэатры спектакль „Тоеснасць", якога моўны пласт у знакамітай частцы складаюць тэксты Уладзіміра Караткевіча са зборніка „Быў. Ёсць. Буду". Сам Караткевіч таксама быў, ёсць і безумоўна будзе, бо не ўяўляю сабе, каб мог трапіць у забыццё яго зачараваны свет раманаў, паэм ці вершаў.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 22

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 18:

Свет, лук, шлях, песня, саснік, ток, Ян, клень. Стан, сок, шпак, лес, ляснік, кухня, Ян, травень.

У гэты раз не было правільных адказаў!



Ніна Такаюк з Мікуліч вучыла маладых удзельнікаў „Жэмэрвы", „Жаўручкоў" і „Праталінкі" як вадзіць веснавы карагод

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Там по маёвуй росі

— Сёлетні фестываль можна назваць юбілейным, бо сем, гэта важная і сімвалічная лічба, паколькі 5, 10, ці 15 практычна нічога не абазначаюць. У сем гадоў малы чалавек пераступае першы парог дарослаці і ідзе ў школу, у Царкве ёсць сем таінстваў, а на багаслужбах запальваецца сямісвечнік. Ці мы, як арганізатары, ужо дарослыя, цяжка сказаць. Важна, каб у гэтай дарослаці заставацца крыху дзяцьмі, а вясна — гэта такі час, калі з дзіцячай радасцю мы ізноў адкрываем Божы свет, — сказаў дырэктар фестывалю „Там по маёвуй росі" Дарафей Фіёнік, заадно старшыня Аб'яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах", якое з'яўляецца яго арганізатарам.

На VII Міжнародным Падляшска-Палескім фестывалі „Там по маёвуй росі", што з 2 па 16 мая праходзіў у Студзіводах, Крывятычах, Моры, Збучы, Чыжах і Шчытах, большую частку спевакоў і танцораў састаўлялі маладыя, так як гэта ад вякоў было ў нашых вёсках. На студзіводскім мерапрыемстве не было яшчэ так вялікай колькасці маладых выканаўцаў народнай творчасці. Хаця старэйшыя жанчыны выступалі з цікавымі і непаўторнымі песнямі, а мужчыны сумелі зацікавіць сабраных вопытнай ігрой на даўніх музычных інструментах, то галоўнымі героямі вяселля і карагодаў былі маладыя дзяўчаты і хлопцы, якія ўдала спраўляліся са сваімі ролямі, а галасістымі спевамі не саступалі старэйшым вопытным і спрактыкаваным носьбітам нашых традыцый. Канешне, прызабытыя і вельмі вартасныя даўнія песні прагучалі з вуснаў старэйшых падляшскіх і палескіх спявачак, якія спецыяльна падрыхтавалі іх на студзіводскі фестываль.

— Вельмі важна, што з нашым фестывалем удалося выйсці на палескую правінцыю, у станоўчым значэнні гэтага слова, дзе найлепш у Беларусі захаваліся нашы традыцыя і культура. Ёсць там тэрыторыі, дзе ў кожнай пятай вёсцы дзейнічаюць самабытныя вакальныя групы, якія захоўваюць аўтэнтычны фальклор. Гэтыя калектывы прэзентуюць у нас непаўторную вельмі багатую народную творчасць. У цэлым за сем гадоў прыехала да нас ужо каля ста старэйшых выканаўцаў і 30-40 дзетак і моладзі. Я думаю, што калектывы з Палесся маюць вялікае ўздзеянне на замацаванне ў нашай публікі беларускай свядомасці, бо гавораць яны так, як гаворыцца на частцы нашай тэрыторыі, — заявіў Дарафей Фіёнік. — Для гасцей з Беларусі прыезд да нас гэта вельмі вялікая падзея, бо ў многіх выпадках гэта іх першы замежны выезд. Яны асабліва рыхтуюцца да яго і вельмі глыбока ўспрымаюць падзеі, што адбываюцца на нашым фестывалі.

У гэтым годзе фестываль, які распачаўся з прэзентацыі разьбы Міколы Тарасюка, выдатна пабольшаў таксама па тэрыторыі і яго ўдзельнікі з Палесся, Літвы і Падляшша мелі нагоду наведаць з карагодамі намнога больш мясцовасцей, чым рабілі гэта ў мінулым. З агулькамі, рагулькамі (як называюць агулькі ў некаторых нашых мясцовасцях), прымаўкамі і танцамі прывіталі яны вясковую публіку ў Чыжоўскай і Арлянскай гмінах, якая прыняла іх вельмі цёпла і сардэчна.

— Вельмі нам спадабаліся карагоды, якія ўдзельнікі фестывалю наперамен вадзілі па вашых сёлах. Відаць было, што тут сапраўдны фальклор яшчэ жывы. Усюды нас шчыра прымалі і мы таксама пад уражаннем мясцовых людзей, якія супольна з намі прымалі ўдзел у карагодах, — заявіла Лена Чурыкова з калектыву „Быліна" з Літвы.

Цёпла і шчыра віталі гасцей у Крывятычах, дзе жыхары сабраліся ў адным месцы і прынеслі з сабой пачастунак. Спевакі з Падляшша, Палесся і Літвы, ідучы па вёсцы, затрымліваліся ў тых месцах, дзе на лавачках у святочны дзень Узнясення Гасподняга (Ушэсця) сядзелі людзі або там, дзе старэйшыя людзі, зацікаўленыя прыгожым спевам, выходзілі з хат пад вароты, каб не толькі паслухаць песень, але паглядзець на прыгожа апранутых спевакоў і танцораў.

— У вашых сёлах нас так сардэчна віталі, жыхары выходзілі да нас з добрым словам. Проста — цудоўная атмасфера. Песні ж у нас падобныя, можа толькі мелодыі крыху іншыя, — сказала Валянціна Чайчыц, мастацкі кіраўнік калектываў „Жаўручкі" і „Журавушка" са Спорава Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

У Чыжах і Збучы да гасцей са Студзіводаў выйшлі беларускія калектывы „Збучанкі" і „Чыжавяне", а збуцкія жанчыны запрасілі гасцей у вясковы клуб на пачастунак і супольнае спяванне.

А на панадворку Студзіводскага музея разьбяры з Брэстчыны з тоўстых таполяў выконвалі гістарычныя постаці.

— Я выконваю постаць Івана Сегяневіча — заснавальніка Студзіводаў, а Анатоль Туркоў з Камянца вырэзвае сімвалічную постаць валялышчыка валёнкаў, які стаіць на фоне авечак. Гэты занятак быў паўсюдны ў Студзіводах. Нам дапамагае Вячаслаў Дародзька з Кобрына, — сказаў разьбяр Уладзімір Чыквін, таксама з Кобрына.

— У 1520 годзе Іван Сегяневіч, самы багаты купец з Бельска і адзін з самых багатых у Вялікім Княстве Літоўскім, купіў зямлю побач горада, дзе быў збудаваны толькі млын. Тут пасля быў заснаваны двор, пачалі пасяляцца людзі, што дало пачатак Студзіводам, — удакладніў Дарафей Фіёнік. — Разныя постаці паставім пры ўездзе ў Студзіводы. У гэтай справе вядзем размовы з гарадскімі ўладамі.

Перад выступамі калектываў з Палесся і Літвы ў Студзіводах ладзіліся вакальныя і танцавальныя майстар-класы, у час якіх замежныя госці вучылі маладых вадзіць карагоды з веснавымі абрадамі і даўнімі песнямі. Блок прэзентацыі веснавых абрадаў, песень і танцаў адкрылі ў Студзіводах „Жэўжыкі" з Падставовай школы № 3 у Бельску-Падляшскім, якімі тры гады апякуюцца Мар'янна Ваўрусевіч і Анна Фіёнік. Паказалі яны абрад Юр'я з народнымі песнямі, качаннем каравая па жыце і закопваннем шкарлупіння ад яек у полі, каб добра расло збожжа. Наймалодшыя ўдзельнікі фестывалю ўжо ведаюць, што без малітвы да Бога і св. Юр'я, апекуна земляробаў і сельскагаспадарчай дзейнасці, не будзе добрага плёну. Адным з важнейшых момантаў на фестывалі была прэзентацыя выбраных песень з кампакт-дыска „Огулькі для Ганулькі", нядаўна выдадзенага музеем, і іншых веснавых твораў у выкананні салістаў і вакальных груп з Падляшша.

— Падляшская вясна распачынаецца са спявання агулек. Гэтым песням, якія мы асабліва палюбілі, прысвяцілі спецыяльнае выданне, дзе бабулькі спяваюць агулькі для Ганулькі, — гаварыў Дарафей Фіёнік.

Найстарэйшы актыўны ўдзельнік фестывалю Ніна Такаюк з Мікуліч вучыла маладых са студзіводскай „Жэмэрвы", „Жаўручкоў" са Спорава і „Праталінкі" з Хрысы (Бярозаўскі раён) як вадзіць веснавы карагод паводле традыцый з яе сяла і заспявала вельмі старую вяснянку. Перад публікай на музейнай плошчы з веснавым рэпертуарам выступілі „Малінкі" з Маліннік, „Згодныя макі" з Райска, спявачкі з Дабрывады і беластоцкая „АБ-БА". У час прэзентацыі веснавога фальклору цёплае надвор'е хутка перамянілася ў дажджлівае, але сабраныя не спалохаліся і надалей заставаліся з народнымі песнямі і танцамі, якія пасля прагналі дождж. Пад вялікім парасонам стаяў таксама Анатоль Вап, дырэктар Дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Маршалкоўскай управы, які цёпла выказваўся пра студзіводскі фестываль. Асабліва гасцям з Брэстчыны спадабаўся выступ сямейнай капэлы Рышарда Лявончука з Бельска з акардэонам, трубкай і барабанам. Музыкі зайгралі даўнія мелодыі, пад даўнія танцы, але не забылі і пра савецкую „Кацюшу".

— Усё тут такое натуральнае, як у жыцці, — сказала мастацкі кіраўнік „Праталінкі" з Хрысы Галіна Суліма.

Дзіцяча-маладзёжны калектыў з вёскі Хрыса выступіў першым з ліку замежных гасцей і паказаў пастаноўку „Вяснянка", абапертую на веснавыя абрады. З выступамі моладзі перапляталіся спевы і размовы старэйшых жанчын з калектыву „Суседкі" з Перасудавіч (Бярозаўскі раён). Галасістыя, але адначасна натуральныя спевы адных і другіх захаплялі не толькі звычайную публіку, але і знатакоў фальклору. Не горш паказаліся маладыя і некалькі старэйшых асоб з калектываў „Жаўручкі" і „Журавушка" са Спорава, а ўсе малодшыя выканаўцы побач сцэны паказалі карагод і танцы.

— На вашым фестывалі ўсё адбываецца так натуральна, як у жыцці. Усё тут арганізавана да толку і няспешна, — заявіла Валянціна Чайчыц са Спорава. — Мы на вашым фестывалі адчуваем сябе як дома.

З асобным фальклорным канцэртам выступіла Група традыцыйнага расійскага фальклору „Быліна" з Вісагінас з Літвы. Публіцы моцна спадабаліся іх меладычныя песні.

— Студзіводскі музей — цудоўнае месца для фальклорных мерапрыемстваў. Спяванне на веснавой прыродзе, калі пахне яшчэ елкай, гэта поўнае шчасце, — сказала Лена Чурыкова з калектыву „Быліна".

Асобнай праграмай была таксама прэзентацыя музычнай культуры вёскі Збуч — песень з выдадзенага ў мінулым годзе кампакт-дыска „Мая матуля пераборнічка". Выбраныя песні з кампакт-дыска заспявалі „Збучанкі". Выступіў таксама вядомы ў Польшчы народны скрыпач Мацей Філіпчук, які пасябраваў са скрыпачом са Збуча Пятром Юшкевічам. Вельмі цікавай як для вясковай, так і гарадской публікі была прэзентацыя вясельных абрадаў спевакамі і музыкантамі з Брэстчыны, Літвы і нашымі выканаўцамі. Спевы і танцы пад скрыпку, гармонік-педалёўку і дуду стваралі вясельную атмасферу з даўняга мінулага.

— Толькі ў нас такое бывае, што маладая з Падляшша, малады з Палесся, а песні спявае ім калектыў з Літвы, — заявіў Дарафей Фіёнік.

Побач калектываў з Палесся і „Быліны" з Літвы вясельныя абрады паказалі „Жэмэрва" са Студзіводаў і калектыў „Вішанька-чарэшанька" з Сухавольцаў. Дзеткі ў сваю чаргу паказалі гульні, якімі ў мінулым займаліся наймалодшыя ў час вяселля. У Шчытах у апошні дзень фестывалю адбыўся вялікі канцэрт народнага фальклору, на якім выступілі падляшскія і замежныя ўдзельнікі мерапрыемства. Спевы і танцы мелі адбыцца на прыродзе, побач рамантаванага будынка былой школы, які Звяз беларускай моладзі прыстасоўвае на Цэнтр адукацыі і прамоцыі беларускай культуры. Аднак з-за дажджу выступы адбыліся ў запоўненай, даволі вялікай зале, з удзелам гмінных і павятовых улад.

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Партрэт беларуса

На партрэтах задуменны твар Віктара Шведа, паміж сямейных здымкаў радасны (бескляпотны) позірк Юры Туронка, у сеціве думак Яўген Вапа, затоплены ў шматлікіх дэкаратыўных цацках айцец Кастусь Бандарук, а з-за постаці Еўфрасінні Полацкай выглядаюць маладыя акцёры тэатральнага гуртка аб'яднання АБ-БА. „Беларусь для мяне гэта мае бацькі, дом маіх бацькоў, Гарадок, мае сябры — таксама беларусы", — кажа з экрана Павел Гжэсь, малады фатограф. „Беларусь — гэта мой другі свет, можа першы, раз першы, другі раз другі, я жыву ў двух светах", — працягвае Юрка Хмялеўскі, дырэктар Цэнтра культуры ў Гарадку. „Гэта нейкая ідэя і ідэал, а вядома, што ідэал цяжка дасягнуць, да яго ўвесь час імкнемся... На гэтым месцы, якое мне Бог назначыў, я павінен рабіць усё, што магу, каб спрыяць Беларусі", — дадае айцец Кастусь Бандарук. Іх галасы чуваць на відэароліку, які 17 траўня разам з партрэтамі прэзентаваў беларускі фатограф Андрэй Лянкевіч.

Андрэй Лянкевіч (на заднім плане) з Зінаідай і Юрым Туронкамі ды іх унукам Аланам

Толькі дзесяць з дзесяткаў персанажаў беларускай меншасці ў Польшчы змог паказаць фатограф у невялічкім кафэ „Мэсіта" ў Варшаве. Гэта камернае, але спрыяльнае месца, схаванае дзесьці ў двары. Можа і не так цяжка там дабрацца, але дождж, які ліў гэтага вечара, здаваўся аддаляць яго дзесьці за гарызонт. Нават хочацца сказаць, што за гарызонт штодзённага жыцця, бо ў такі спосаб Андрэй Лянкевіч паказвае герояў сваіх фатаграфій.

— Гэты вобраз такі лірычна-манументальны, гэта такая лірыка і самота ў кожным чалавеку, які адначасова з'яўляецца манументам, штосьці перамог, чагосьці дабіўся, даўмеўся. Праект можа карысна паўплываць на імідж беларускай меншасці ў самой Беларусі, — мяркуе Вольга Гардзейчык-Мазярская, беларуска, якая ў Польшчы жыве дзесяць гадоў. — Мне было цікава пабачыць выстаўку, бо так, як Андрэй, усё ж такі стараюся аглядаць беларускую рэчаіснасць з перспектывы Беларусі, хаця вядома, што лёгка гэта не прыходзіцца. Але здаецца мне, што беларускую меншасць успрымаем у падобны спосаб.

Калі мы пазнаёміліся, веды пра беларусаў у Польшчы ў Андрэя былі вельмі агульныя.

— Так і было. Зразумела, не пустымі былі такія лозунгі як „Басовішча". Ведаў я, што тут выдаюцца кніжкі, газета, паўстае музыка, але людзі ў Беларусі не ведаюць як жывяце, чым займаецеся. А тут жа квітнее жыццё, культура. Я быў у шоку, калі пабачыў маштаб працы, якая тут вядзецца. Калі паспрабаваў скласці спісак калектываў, якія хацеў фатаграфаваць, аказалася, што ідуць яны ў дзесяткі. Гэта ж цудоўна.

Не заглядаючы на сайт беларускай „Нашай Нівы" можа і я таксама не ведала б Андрэя. Быў бы ён толькі адным з многіх не чужых прозвішчаў... каб не славутая „Камуністка".

— Гэты здымак прынёс мне шмат чаго добрага, — расказвае Андрэй. — Можа таму я хацеў падзякаваць гэтай жанчыне са здымка, але яна амаль недаступная. Жыве сама, людзей не дапускае, верыць у адзіную ідэалогію, адзначае камуністычныя святы. Здымак, які друкавалі часопісы ўсяго свету, здаецца незвычайным. Жанчына ідзе з камуністычным сцягам па цэнтральнай плошчы Мінска. Гэта яе рытуал, але мне ўдалося яе злавіць у адпаведную хвіліну, у добры час.

І так стала яна творчым сімвалам Андрэя Лянкевіча, эканаміста па адукацыі, фатографа-дакументаліста па прафесіі, выкладчыка фотажурналістыкі. „Камуністка" стала яму варотамі ў кар'еру. „New York Times", „Le Figaro", „Der Spiegel", „Newsweek" — гэта далёка не ўсе загалоўкі сусветных выданняў, у якіх друкавалі Андрэевы здымкі. Яго патрабуюць не толькі як журналіста, каментатара, але і мастака.

— Ведаеце, гэта можа здавацца нечаканасцю, бо я хлопец выхаваны на вёсцы, а дабіўся такіх поспехаў. Але гэта дзякуючы працы і пасіі. Я кахаю тое, што раблю, але фотажурналістыка гэта не ўсё, да чаго мяне цягне. Я хачу не толькі распавядаць сваімі здымкамі гісторыі, але перш за ўсё ставіць пытанні. Калі няма пытанняў, няма сэнсу працы. А пытанні ставім наогул у складаных сітуацыях.

Сабе Андрэй таксама ставіў цяжкія пытанні, як гэтае пра тоеснасць. Ён з Гродзеншчыны, польскай і беларускай. Думаў, што ён паляк, але дзякуючы добра пастаўленым пытанням знайшоў адказ, адназначны: беларус. І гэтага прытрымліваецца. Наступствамі гэтых вырашальных момантаў, думаю, з'яўляюцца і тэмы, якія паглынаюць гэтага фатографа. „Сямейныя вартасці" ці „Беларускія паганскія традыцыі" — гэта адзін са спосабаў шукаць сябе і паказваць іншым сутнасць быцця беларусам, багацце нашай спадчыны, будзённасць сучаснікаў ды перспектывы, не заўсёды аптымістычныя.

Калі гаварыць пра яго расказ аб беларускай меншасці ў Польшчы, адчуваецца своеасаблівая місія.

— Я атрымаў стыпендыю ад Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы, якую атрымліваюць беларусы і ўкраінцы, каб рэалізаваць свае праекты на тэрыторыі Польшчы. Я прыдумаў цыкл здымкаў, якія складуць вобраз беларускай меншасці ў Польшчы, бо гэта неабходнае паказаць тых людзей, тую працу, паказаць як тут разумеецца Беларусь, што яна абазначае для беларусаў у Польшчы. З цягам часу ставішся да гэтых беларусаў не як да дыяспары, а як да беларусаў, якія засяляюць мінулую, гістарычную Беларусь.

З ліку герояў гэтага праекта Андрэй найчасцей успамінае сустрэчы з гісторыкам Юры Туронкам ды пісьменнікам Сакратам Яновічам.

— Мне адкрылася цэлая цывілізацыя, калі я слухаў іхнія расказы, пачаў глядзець па-іншаму на беларускую гісторыю і культуру.

На вернісаж у Варшаве ўдалося даехаць сям'і Юрым Туронка — з жонкай, унукам стварылі яны амаль дыскусійны клуб. Сядзелі пры століку, гаварылі пра здымкі, расказвалі анекдоты, час ад часу заглыбляліся ў беларускую рэчаіснасць.

— Першае ўражанне ад здымкаў было дзіўнае, — кажа Юры Туронак. — Я думаў, што гэта будуць такія нармальныя здымкі, а гэта ж мастацтва, на якім, дарэчы, лепш разбіраецца мая жонка (*смех*).

— (*смех*) Яны сапраўды цікавыя, далёкія ад рэальнасці, але такія зачараваныя, — прызнае Зінаіда Туронак.

Калі я пытала ўдзельнікаў праекта як ім падабаліся ўласныя вобразы, аказвалася, што не кожнаму ўяўленне Андрэя даспадобы, асабліва пры першым сутыкненні. З часам прыходзіць зразуменне для такой задумы. Такі праект гэта не толькі ідэя, але і пошукі мастацкіх сродкаў, якія ў змозе перадаць настрой і кантэкст.

— Здымкі напэўна ўсяго не паказуць, таму ідучы ўслед за мультымедыйным падыходам да свету і мастацтва, я адначасова рыхтую відэа, — расказвае Андрэй. — Стараюся кожнага спытаць і запісаць на відэакамеру адказ на пытанне: што абазначае для цябе Беларусь? Гэта дапоўніць сэнс праекта.

Пачаткова цэлы праект мела завяршаць кніжка са здымкамі і расказамі пра беларусаў, нешта з гатунку „Хто ёсць кім... на Падляшшы", але чарговыя сустрэчы прыводзяць Андрэя да штораз большых сумненняў.

— Я пачынаю разумець, што маё пачатковае захапленне было толькі дзіцячай радасцю ад таго, што раблю нешта важнае. Далей я так думаю, але разам з ідэйнасцю сустрэла мяне цвёрдая рэчаіснасць. Беларуская меншасць у Польшчы, пэўна як кожная група, мае шмат сваіх праблем, недаразуменняў, нюансаў, у якія мне штораз часцей не хочацца брысці. Самае галоўнае, аднак, каб глядзець на гэтае грамадства ў катэгорыях беларускай нацыі, бо ўсё, што характэрнае беларусам, мае сваё адлюстраванне і ў гэтай грамадзе. Часта вяртаюся да важнага пытання, якое ставіць таксама Юры Туронак, пытання пра пераемнасць пакаленняў, пра будучыню беларусаў, якую ўсе супольна будуем.

Літаратурныя падарожжы

(польскамоўныя пісьменнікі на Берасцейшчыне)

VII

Наступны этап нашага літаратурнага падарожжа — Баранавіцкі раён. З ім найбольш звязаныя імёны Ігната Дамейкі (вёска Сычыўкі), Яна Чачота (маёнтак Яршова, пасёлак Новая Мыш), Адама Міцкевіча (в. Завоссе, Сталавічы, Паланэчка). Ад некаторых населеных пунктаў засталіся толькі ўспаміны ды назвы ў літаратурных даследаваннях і архіўных дакументах. Другія жывуць актыўным жыццём і з удзячнасцю ўспамінаюць тых, хто праславіў гэтыя мясціны сваёй прысутнасцю.

На тэрыторыі Баранавіцкага раёна (за вёскай Карчова, непадалёку ад Туганавічаў) знаходзіцца велізарны валун, які, па паданні, быў некалі трыбунай, з якой гучалі прамовы студэнцкай моладзі пра асвету народа, пра неабходнасць маральнага самаўдасканалення, пра патрэбу ведаць свой край і аддаваць служэнню яму свае сілы. Называлі гэты валун (і дагэтуль называюць) каменем філарэтаў, таму што маладыя людзі, што збіраліся каля яго, былі філаматамі і філарэтамі. Галоўнай задачай лічылі яны вывучэнне роднага краю. Але, на жаль, на самой справе выйшла так, што значны ўклад у развіццё навукі і культуры яны ўнеслі, але не на радзіме. Ігнат Дамейка — у Чылі, Юзаф Кавалеўскі, Тамаш Зан і іншыя — у Расіі і г.д.

Вось як аб гэтым слушна гаворыць Кастусь Цвірка ў сваёй працы „Паданне пра філаматаў, або Доля аднаго пакалення": „Высылаючы філаматаў і філарэтаў з „акругі Віленскага ўніверсітэта" ў Расію, царскія ўлады хацелі дасягнуць адначасова некалькі мэтаў: першая — гэта, вядома ж, пакаранне маладых людзей за вальнадумства — «в назидание» іншым, другая — знішчэнне ў самім зародку беларускага нацыянальнага руху як часткі агульнапольскага (лепш бы сказаць агульнарэчпаспалітаўскага) руху і трэцяя — рабаванне „мазгоў", інтэлектуальнага патэнцыялу Беларусі".

Несумненна, першым у спісе філаматаў і філарэтаў быў Адам Міцкевіч, пасля — Ян Чачот, Тамаш Зан, Аляксандр Ходзька, Антон Адынец, Ануфры Петрашкевіч. Не ўсе яны сталі пісьменнікамі ці паэтамі, але іх дзённікі, нататкі, лісты — таксама літаратурнае наследдзе.

Ян Чачот

Ян Чачот — гэта досвітак беларускай літаратуры, яе першыя крокі, прадвесне нашага нацыянальнага адраджэння.

Кастусь Цвірка

Радавыя карані Яна Чачота па мацярынскай лініі — у Баранавіцкім раёне. Сёння не знойдзем на карце Берасцейшчыны паселішча Яршова каля Моўчадзі, дзе адзін з продкаў пісьменніка атрымаў у 1545 годзе права на валоданне маёнткам. У цяперашнім Гарадзішчанскім сельсавеце дзед пісьменніка гаспадарыў у вёсцы Гараінаўшчына. Бацька, будучы беззямельным шляхціцам, узяў у арэнду маёнтак Рэпіхава (сёння Ляхавіцкі раён). Сваёй малой радзімай Ян Чачот лічыў вёску Мыш у Баранавіцкім раёне, хоць нарадзіўся на Гарадзеншчыне (в. Малюшыцы Карэліцкага раёна).

Сябры нават далі яму мянушку Ян з Мышы. Чытаючы яго вершы і балады, бачым, што часцей у іх сустракаюцца ўспаміны аб рэчцы Мышанцы, аб краявідах Мышы, аб насельніках гэтага краю: „Калдычэўскі шчупак", „Мышанка", „Узногі" і інш.

У аснову балады „Мышанка" леглі дзве легенды, у якіх расказваецца аб узнікненні назваў мястэчка Мыш і рэчкі Мышанка.

О мілы ўспамін! Дарагая Мышанка
Зноў снішся ты ў барве заранак.
Найпершая ў свеце мая ты калыханка,
Мільгнуў тут жыцця майго ранак.
Мае ўсе тут гульні, блуканні, забавы,
Высочваў тут рыбку я днямі,
Траву нёс кароўкам, рваў кветкі рухавы
Тут „біўся" не раз з „казакамі".

Узногі — вёска ў цяперашнім Малахавецкім сельсавеце. Некалі там жыў пан, які са звярынай жорсткасцю ставіўся да прыгонных сялян.

Паэт баладай „Узногі" асуджае паншчыну і сцвярджае думку, што зло павінна быць пакарана.

Народнае паданне пра акальцаванага шчупака, злоўленага ў Калдычэўскім возеры, легла ў аснову трэцяй балады „Калдычэўскі шчупак". Дарэчы, песні і вершы Ян Чачот пісаў па-беларуску, балады — толькі па-польску.

Навучаючыся ў Наваградскай гімназіі, Чачот знаёміцца з Адамам Міцкевічам. Яны адразу ж пранікліся адзін да аднаго сяброўскімі пачуццямі і пранеслі іх праз усё жыццё.

Будучы студэнтам Віленскага ўніверсітэта, Ян Чачот прымаў актыўны ўдзел у мерапрыемствах, якія ладзілі філаматы і філарэты. Пасля разгрому студэнцкай арганізацыі большасць удзельнікаў была выслана ў бязмежныя сібірскія прасторы. Чачот трапіў на Урал. Затым былі Кізляр, Уфа, Цвер, Таржок і іншыя мясціны, дзе давялося пабываць паэту.

Цяжка хвораму Чачоту дазволілі ў 1833 годзе вярнуцца на радзіму. Спачатку — на Віцебшчыну, дзе займаўся запісам беларускіх народных песень, якія затым перакладаў на польскую мову.

З 1841 па 1844 гады працаваў у знакамітай бібліятэцы Яўхіма Храптовіча ў Шчорсах. Затым была праца над выданнем шасці кніг беларускіх народных песень „Сялянскія песенькі з-пад Нёмана і Дзвіны", якую Чачот ажыццявіў ужо на Баранавіччыне.

Памёр паэт у санаторыі г. Друзгенікі (Літва) у 1847 годзе.

У 1996 годзе ў пасёлку Новая Мыш Яну Чачоту быў адкрыты помнік.

(Працяг будзе)

Тамара ЛАЎРАНЧУК
г. Высокае

Творчасць Максіма Танка добра вядомая практычна кожнаму, хто так ці інакш сутыкаўся з беларускай літаратурай. Ураджэнец Заходняй Беларусі Яўген Скурко, такое сапраўднае імя паэта, перажыў з ёю ўсе значныя падзеі, што адбываліся ў тых мясцінах цягам мінулага стагоддзя. Бежанства, вяртанне, жыццё ў санацыйнай Польшчы, Другая сусветная вайна — усё гэта не магло не накласці адбітак на ягоную паэтычную творчасць, аб якой вядзецца гутарка на сайце, які так і называецца „Паэтычная творчасць Максіма Танка".

Месціцца даны інтэрнэт-партал па адрасе http://maksimtank.ru і мае некідкае спакойных колераў выяўленне. Зроблены ён даволі сціпла і падзелены на дзве часткі. Зялёны колер розных адценняў пераважае, таму падаецца, што знаходзішся ў нейкай дуброве, дзе шапатлівае лісце, калі ўважліва прыслухацца, даносіць словы з вершаў паэта.

На галоўнай старонцы сайта размешчана своеасаблівае прывітанне аўтараў сайта да віртуальных наведвальнікаў. „Максім Танк, — адно з самых яркіх імёнаў у гісторыі беларускай літаратуры, — пішуць яны, жадаючы распавесці пра сваю павагу да паэта. — Паэт-бунтар, паэт-патрыёт, паэт-сатырык, паэт-філосаф, паэт-наватар... А «па жыцці» надзвычай сціплы чалавек, які не любіў гучных слоў і бляску пражэктараў. Паэзія Максіма Танка ўражвае разнастайнасцю тэм, вобразаў, форм, творчым засваеннем нацыянальнай паэтычнай традыцыі і наватарствам. А галоўная тэма, якая праходзіць праз усю творчасць М. Танка, — Радзіма ў самых розных яе праявах: гісторыя і яе адлюстраванне ў легендах і паданнях, праца, песні, мары народа, маляўнічая прырода, мілагучная родная мова".

Усе выйсці на рубрыкі сайта месцяцца зверху выяўлення. Іх не надта многа, але іх змест выдатна раскрывае ўсё, што звязана з паэтам. Там знаходзяцца вершы, ягоны жыццяпіс, бібліяграфія, рэцэнзіі і аналіз.

Калі звярнуцца да рубрыкі „Жыццяпіс", то яна ўражвае сваёй насычанасцю. Без перабольшвання можна сцвярджаць дзве рэчы — Максім Танк пражыў вартае добрай зайздрасці багатае падзеямі жыццё, а даследчыкі ягонай творчасці някепска парупіліся, збіраючы іх апісанні ў адзіны вялікі тэкст.

Але найбольшай рубрыкай з'яўляюцца „Вершы". Па вялікім рахунку, тут няма нічога дзіўнага. Максім Танк нездарма лічыцца выдатным паэтам, таму колькасць ягоных вершаваных твораў сягае далёка за сотню. Дзеля большай зручнасці ў знаёмстве з творчасцю Танка, распрацоўшчыкі сайта прадугледзелі іх тэматычнае дзяленне. Яно ёсць як у „Вершах", так і на галоўнай старонцы.

Пра тое, як ацэньваюць творчасць Максіма Танка літаратурныя крытыкі, можна даведацца з рубрыкі „Рэцэнзіі і аналіз". Адной з найбольш цікавых рэцэнзій на вершы Танка падаецца агляд ягонай давераснёўскай (1939 года) творчасці, які зрабіў нейкі невядомы, згодна інфармацыі на сайце, аўтар: „Можна вінаваціць паэта ў многіх грахах. Хоць бы ў тым, што паверыў у камуністычную, у цэлым утапічную ідэю. Можна папракаць у максімалізме праяўлення любві да ідэалаў, якія заліваліся крывёю сталінскімі сатрапамі. Так, напрыклад, тое, што не заўважыў дэфармацый на ўсходзе Беларусі. Але гэта з пазіцый сённяшняга дня".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Сухая серыя БАТЭ

У мінулыя выходныя з інтэрвалам у адзін дзень былі вызначаны ўладальнікі футбольных Кубкаў Польшчы і Беларусі. Лаўрэатам пачэснага трафея ў Рэчы Паспалітай першы раз у гісторыі стала беластоцкая „Ягелонія", якая ў фінале адолела шчэцінскую „Пагоню" — 1:0. Вырашальны мяч на 49-й хвіліне забіў летувіскі легіянер, абаронца Андрус Скерла. Шчыра віншуем беластоцкую каманду з гэтай знакавай вікторыяй! Так пішуцца слаўныя старонкі летапісу каманды.

А Кубак Беларусі аспрэчвалі барысаўскі БАТЭ і жодзінскае „Тарпеда". На жаль, роўнага змагання не атрымалася. БАТЭ ўвогуле ўнікальная каманда ў беларускім футболе, пра што не раз даводзілася пісаць. У гэтым сезоне чэмпіёны нібы павесілі замок на сваю брамку. Мяркуйце самі — Кубак сезона, 11 гульняў у чарговым чэмпіянаце і плюс яшчэ фінальны матч Кубка, дзе барысаўцы выйгралі ажно 5:0, без адзінага прапушчанага гола. Да гэтага рэкорд „сухасці" належаў „Гомелю", які не прапускаў са старту 11 матчаў чэмпіянату запар у 2003 годзе. БАТЭ такое ўжо паўтарыў і мае шанцы прадоўжыць рэдкую для сучаснасці серыю. А Віктар Ганчарэнка як трэнер дасягнуў гросмайстарскага выніку — 50 перамог у 73 гульнях чэмпіянату. Што датычыць кубка краіны, то яго БАТЭ заваяваў другі раз у сваёй гісторыі.

Прытым адрыў барысаўцаў пасля завяршэння першага круга (нагадаю, што эксперыментальнае першынство сёлета пройдзе ў тры колы) зусім невялікі. На пяты чэмпіёну літаральна наступае бабруйская „Белшына", якая толькі сёлета вярнулася ў вышэйшы дывізіён і пачуваецца ў ім упэўнена. Становішча ў чэмпіянаце зараз такое: 1) БАТЭ — 25 ачкоў; 2) „Белшына" — 23; 3) „Дынама" (Мінск) — 20; 4) ФК „Мінск" — 20; 5) „Дынама" (Брэст) — 15; 6) „Дняпро" (Магілёў) — 15; 7) „Шахцёр" (Салігорск) — 15; 8) ФК „Віцебск" — 12; 9) „Нафтан" (Наваполацк) — 11; 10) „Нёман" (Гродна) — 10; 11) „Тарпеда" — 9; 12) „Партызан" (Мінск) — 1.

Дзве каманды ўжо „згубілі" сваіх галоўных трэнераў. Эдуард Малафееў па стане здароўя пакінуў стан салігорцаў — трыумфальнага вяртання ў Беларусь не атрымалася. Ну і канешне чарговая адстаўка ў сталічным „Дынама" — „смерцю храбрых" паў Сяргей Гурэнка, які, як і бальшыня яго папярэднікаў, не пратрымаўся і сезон. Што цікава, пасля яго зыходу мінчукоў нібы прарвала на ўдалую і выніковую гульню. Але Сяргею Саладоўнікаву таксама доўга кіраваць не давялося — новым галоўным белаблакітных прызначаны Уладзімір Гольмак. Гродзенскі „Нёман" толькі ў апошнім матчы парадаваў сваіх прыхільнікаў першай вікторыяй. Нёманцы на выездзе адолелі нядошлы „Партызан" — 4:0. Хет-трыкам вызначыўся форвард Дзмітрый Кавалёнак, у якога стала 5 забітых галоў. Больш толькі ў жодзінца Паўла Бяганскага — ён даслаў у сетку 6 мячоў. Стан футбола на Гродзеншчыне зараз гаротны — у другім дывізіёне слонімская, лідская і смаргонская каманды таксама плятуцца ў хвасце. Мінулы тыдзень у краіне быў абвешчаны тыднем гульні нумар адзін. Найбольш гучна рапартавалі пра масавасць мерапрыемстваў гродзенскія чыноўнікі, што было смеху варта. У мінулую сераду зазірнуў я ў Новы парк, дзе на ўскрайку размешчаныя футбольныя пляцоўкі — на 4-х з 5-ці было абсалютна пуста, і толькі на адной бегалі маленькія дзеткі. Вось і ўся масавасць!

У беларускім футболе па-ранейшаму ў цэлым не дбаюць пра рэзерв. Ну а там, дзе дбаюць, як у Барысаве, то і вынік відавочны.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

ДЗЁННІК ПАСЛЯ СМЕРЦІ

(АДЫШОЎ ПРАФЕСАР ВАСІЛЬ БЕЛАКАЗОВІЧ)

— 2 —

ГУТАРКІ І РОЗДУМЫ

Хоць ад смерці майго дзядзькі, бл. п. праф. Васіля Белаказовіча, прайшло ўжо некалькі тыдняў, надалей мне цяжка пісаць пра ягоную смерць. Тым больш, што прыйшла яна, як гэта часта бывае, неспадзявана. І хоць быў у мяне звязаны з ёю сон, дык наогул нікому яна нават і не снілася, нягледзячы на ягоны немалады ўжо ўзрост. Прафесар да апошніх сваіх дзён быў актыўным вучоным: пісаў, выступаў, чытаў лекцыі студэнтам, прымаў удзел у навуковых канферэнцыях, рыхтаваў у друк новую кніжку. І тут, быццам бы, як гром з яснага неба...

Даведаўшыся пра яе ад д-ра Янкі Трахімюка ў аўторак 23 лютага г.г. а 22.34, падумаў я, што няма сенсу трывожыць ужо цётку Тамару ў гэтую пару. А 23.45 вырашыў пазваніць д-р Моніцы Зялінскай, якая ўжо некалькі разоў раней спрабавала да мяне дазваніцца на неактуальны нумар майго тэлефона. Нягледзячы на познюю пару, вельмі ўцешылася, што я ёй пазваніў. Усхваляваная, расказвала пра ўсё, звязанае са смерцю Прафесара. На працягу адносна нядоўгай размовы (16 хвілін, 22 секунды), я фактычна пра ўсё ад яе даведаўся: пра абставіны смерці, месца і час пахавання.

На другі дзень, хоць зразу не мог дазваніцца цётцы, я ўсё ўжо аб усім ведаў. Цётка Тамара толькі пацвердзіла тое, пра што я пачуў ужо раней. Спроба магчымай маёй нейкай дапамогі таксама выявілася лішняй. Да цёткі дазваніўся я толькі а 21.49, выказваючы словы глыбокага і шчырага спачування.

Падумаў я, што добра было б паведаміць аб гэтым сяброў бл. п. Прафесара. І так, 24 лютага ў сераду а 12.21 пазваніў я спачатку пісьменніку Васілю Петручуку. Пісьменнік усё ўжо амаль аб усім ведаў. Пра смерць дзядзькі даведаўся ў аўторак. Вельмі шкадаваў з гэтай прычыны. Назваў бл. п. дзядзьку „чалавекам прыхільным усім людзям і народам". Паведаміў пры нагодзе пра выхад сваіх „Крышынак". Наракаў на дрэнную карэктуру і шмат памылак у кніжцы.

А 12.43 званю ва Універсітэт Марыі Кюры-Складоўскай пляменніцы бл. п. Прафесара, Дароце Клімовіч (уроджанай Белаказовіч). Расказала яна мне пра сон яе маці, які, як быццам, прадвяшчаў адыход Прафесара. Вельмі шкадавала і была ўдзячная, што яе аб гэтым паведаміў.

У той жа час спрабуе яшчэ да мяне дазваніцца д-р Янка Трахімюк. Дазваніцца а 12.49. Крыху быў здзіўлены, што некралогі ў „Газеце выборчай" з'явіліся толькі ў варшаўскім выданні, у дадатку „Gazeta w Warszawie". Гаварылі, між іншым, пра стан ранейшага здароўя бл. п. Прафесара. Пра сны, якія раней прысніліся мне (12-13 дзён да смерці з 8 на 9 лютага г.г.) і маме Дароты. Успаміналі Прафесара.

А 13.13 званю яшчэ паэту Віктару Шведу. Паэт ужо ў аўторак ведаў аб смерці бл. п. дзядзькі. Як гаварыў, быў „так ашарашаны" смерцю дзядзькі, „найбліжэйшай яму асобы", што „не мог нават думаць". У трубцы на працягу ўсёй размовы чутны тыя ж трэскі, што і раней. Паэт гаварыў, што напіша верш прысвечаны Прафесару. Падтрымліваю яго на духу. Гэты верш, пад загалоўкам „Развітанне", „Ніва" змесціць пасля ў 10 нумары.

Юрка ТРАЧУК

Сабакі і людзі

Бывае, што жыхары вёсак, якія выбраліся на пастаяннае жыхарства ў горад, едучы на аўтамашынах да сваіх бацькоў або дзядоў у вёску, выкідваюць сваіх сабак, што сталі ім цяпер непатрэбнымі. Сабакі — якія хочаш: лахматыя і гладкія, пярэстыя, малыя ды вялікія. Бегаюць яны па вёсцы, заглядваючы на кожны панадворак, шукаюць, каб чымсьці пажывіцца. Тыя сабакі не баяцца людзей і бываюць ад голаду нахабнымі, так што старэйшаму чалавеку без калочка страшна выходзіць на вуліцу. А што гаварыць пра дзяцей, што прыязджаюць у вёску да сваіх дзядоў.

Дарагія гараджане, не выкідвайце сваіх „непатрэбых" сабак проста на вуліцу, аддайце ў прытулак, або ўвогуле не заводзьце іх. Гэтак як і з людзьмі бывае: „Служы пану верне, а ён табе п...е"!

Тавары і людзі

Прадуктовыя аб'язныя крамы ездзяць па вёсках і прадаюць тавар. Ставяць на яго розныя цэны, не маюць фіскальных кас. Прадавец, адначасова вадзіцель, выходзіць з кабіны самахода на вуліцу, уваходзіць у кузаў, — а там тавар ляжыць часта проста на падлозе. Так адбываецца кожны раз, дзе прадавец спыніцца. Вядома, не мае дзе памыць рук. Толькі адна прадуктовая аб'язная крама з Беластока, якая да нас заязджае — а гэта крама з магазіна „Пятро і Павел", што на Засцянках, мае фіскальную касу. І ў машыне належны ў іх парадак, і вельмі прыхільны і ветлівы прадавец.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Нарэшце!

Кожны, хто наведваў Белавежу апошнімі гадамі, моцна здзіўляўся дрэнным выглядам адной з найважнейшых тут вуліц — вул. ген. Аляксандра Вашкевіча. З 1998 года, калі ў сувязі з пракладкай каналізацыі здзерлі на адным баку вуліцы тратуары і фрагменты асфальту на маставой у суседстве тратуараў, у такім стане заставалася яна дагэтуль. Праўда, у наступным годзе на невялікім адрэзку тратуар праклалі нанова, але гэта справы не вырашала. І, вось, сёлета вуліца нарэшце будзе даведзена да парадку! Працы на ёй ужо распачаліся і маюць завершыцца з канцом канікул. Інвестыцыя гэтая рэалізуецца супольнымі сіламі Гайнаўскага павета і Белавежскай гміны, пры выкарыстанні паловы сродкаў з праграмы г.зв. „схетыновак".

Пётр БАЙКО

Развяжанні пра рынак

Уладзімір СІДАРУК

Кузава — адна з большых вёсак Чаромхаўскай гміны. Налічвае больш за сотню дамоў. Многія з іх пустуюць. Гаспадаркай займаюцца толькі некаторыя жыхары. Праўда, большую частку насельніцтва складаюць пенсіянеры, бо маладыя неахвотна ставяцца да земляробства. Тлумачаць, што сельская гаспадарка прыносіць адны затраты.

Нядаўна я наведаў сябрука. Вось што расказаў мне Міхась Б.

— Восенню я пасеяў жыта. Харашэнька паўзыходзіла. Здавалася, прыбытак будзе. Але вясною вымушаны быў жыта прыараць, бо пад снегам на незамёрзлай зямлі яно спарылася. Вось, даражэнькія, якая гэта наша эканоміка. Селянін араў поле, сеяў збожжа, збіраў ураджай ды за гадзіну працы камбайна вымушаны быў плаціць 260-300 зл., каб напрадвесні ў Кляшчэлях на рынку прадаць жыта скупшчыку па 20 зл. за цэнтнер. Кашмар! Каб выручыць адну гадзіну працы камбайна, дык трэба было б прадаць паўтары тоны жыта. Аднавяскоўцы, якія зрабілі пасевы на цяжэйшым грунце, не могуць лічыць на ўраджай, бо збожжа як не спарылася, дык вымакла. Скарыстаюць тыя сяляне, што захавалі збожжа з мінулагодніх ураджаяў. Яны мелі шчасце ў няшчасці: не прадаў, значыцца, выйграў...

***

16 траўня гуляў я на ровары па наваколлі. За кузаўскім могільнікам сустрэў я ў лесе аднавяскоўца, грыбніка, 74-гадовага Мікалая Саўчука.

— А ты, Мікалай, пэўна ў лесе начуеш, — жартам кідаю ў бок сябра.

— Рашыў у „Ракітынах" за бульбай паглядзець ці дзікі не ўварваліся, — патлумачыў калега.

— І як яна там?...

— Палетак у два рады жэрдкамі абгарадзіў і фольгавыя мяшочкі паначапляў. Здаецца, што гэта адпуджвае звярыну...

— А як бульба на рынку плаціцца? — пераводжу гутарку на іншую тэму. — Не прыходзілася быць у Кляшчэлях?

— У апошні панядзелак вялікі рынак быў, — канстатуе суразмоўца. — Бульбу прадавалі па 70- 80 зл. за цэнтнер. За пшаніцу прасілі па 50 зл., за жыта — 25 зл., а за кукурузу — па 80 зл. Гэтай апошняй я мяшок купіў за 40 зл. на муку грубага памолу на корм для бройлераў. Жонка гадоўляй займаецца. У год да трох кілаграмаў вагі штука даходзіць, а нават і больш. Але і так выручка ад гадоўлі невялікая. Корм каштуе...

— А як свініна плаціцца?

— Пра жывую вагу не магу сказаць. Заказаў у мяне кузавец з Беластока вепручка, але пра цану не гаварылі. На тыдні мае прыехаць дагаворвацца, — паясняе Мікалай Саўчук. — А сваяк купіў парку парасят за 220 зл. Тыдзень таму можна было купіць іх нават за 190 зл.

«Больш тавару на рынку, значыцца, і цана меншая. Такая ўжо логіка рыначнай эканомікі», — падумаў я, развітваючыся з калегам.

Адгаданка



1. засцерагальны кавалак матэрыялу, які апранаюць спераду для прадухілення забруджання вопраткі, 2. несправядлівасць, 3. метал на рэйкі, 4. фальклорная партнёрка яваpу, 5. штраф за невыкананне абавязацельства, 6. жэнеўская рака, 7. карцёжная фігура, 8. жэнеўскае возера, 9. негусты аўсяны кісель, 10. шумерскі бог зямных вод, адпаведнік вавілонскага Эа, 11. адступленне ад афіцыйных царкоўных догмаў, 12. палоска, якая аддзяляе суседнія палеткі, 13. іспанскі горад між Барселонай і Сарагосай, 14. пакалечаны чалавек, 15. аўтар „Антыгоны".

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Станіслава Леца. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 17 нумара

Дружына, лясун, негатыў, паж, уюн, Тун, Мінск, Осцін, кларнет, чарга, помач, Ош, Сайгон.

Рашэнне: **У кожным лесе знойдзецца шакал.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Тэкст і фота Юркі ЛЯШЧЫНСКАГА

Чарнагорыя гэта 90 працэнтаў гор або праваслаўныя горцы над Адрыятыкай

— Адкуль ты? — пытаецца ў мяне Мілан, двухметровы ўласнік пансіёна ў Рафаловічы, прадмесці Будвы, што на чарнагорскім узбярэжжы Адрыятычнага мора.

— Што? — крыху збянтэжана пачынаю свой адказ. — Адкуль... з Беластока! — цікава, ці ён ведае, дзе гэта.

— А-а-а... То ты рус! — упэўнена, але і з сімпатыяй каментуе чарнагорац.

— Праваслаўны? — распытвае далей.

— А як жа, праваслаўны, беларус! — таксама не без скрыванай радасці адказваю яму.

— Рус, рус, нэ поляк, рус!

* * *

Русафільства чарнагорцаў мае не толькі гістарычныя падставы. Сёння даходзіць яшчэ сучаснае, эканамічнае перш за ўсё, вымярэнне.

Большасць турыстаў, што адпачываюць на чарнагорскім узбярэжжы, гэта „рускія” — ці гэта расіяне, ці ўкраінцы, ці беларусы ці нават літоўцы.

Хаця гэтыя апошнія, дэманстратыўна апранутыя ў футболкі з літоўскімі эмблемамі, святкавалі перамогу літоўскай каманды на баскет- ці валейбольных чэмпіянатах, якія праходзілі ў суседняй Сербіі. А мясцовае тэлебачанне іх транслявала, а, вядома, у такіх турыстычных раёнах кожны паб, кафэ, каноба ці рэстаран нават ладзіць для сваіх кліентаў нейкія латарэі (зразумела, з магчымасцю выйгрышу, або часцей пройгрышу заложаных грошай).

Стаўка на „рускіх” турыстаў мае сваё адлюстраванне яшчэ і ў тым, што большасць экскурсаводаў, афіцыянтаў ці яшчэ каго там сяк-так авалодала рускай мовай. Таму на такую арганізаваную мясцовым транспартам экскурсію „з рускім гідам” ездзяць і эстонцы, і палякі.

А вяртаючыся да ўласнага пансіёна Мілана, калі так сімпатычна пачалі мы нашае знаёмства, дык я распытаў у яго пра асноўныя справы. Ён жа і параіў мне якое віно лепшае, якая ракія павінна мне спадабацца, дзе рабіць пакупкі і г.д. Дык вось віно *Vranac* або *Krstac*, ракія — *Loza*, значыць, з вінаграду, аднак найлепшая хатняга вырабу, якую тут называюць *домача*, значыць хатняя. А піва лепшае з бочкі, чымсьці з бутэлькі. А трэба афіцыянту казаць *точэмо піва*. А так наогул то найлепшыя цэны ў ягоным рэстаране на першым паверсе, за пакупкамі таксама лепш схадзіць у магазін у той жа самай ягонай краме. Ну, што ж, мо зачаста я і не заглядаў у такія месцы, але часам, вяртаючыся з вечаровай прагулкі, заходзіў у рэстаран на першым паверсе, дзе з усмешкай вітаў мяне двухметровы Мілан. Дарэчы, не толькі ён адзначаўся такім ростам. Наогул характэрнай рысай чарнагорцаў з'яўляецца іх росласць. У баскетбольных і валейбольных камандах былой Югаславіі шмат было чарнагорцаў, маўляў, звышпрапарцыянальна.

Аднак не рост людзей здзіўляе. Далёка не тое. Толькі валюта, мясцовая валюта. Ад 1 студзеня 2002 года, калі ў Еўрасаюзе ўвялі еўра, Чарнагорыя прыняла таксама ж валюту, якая адрознівалася ад саюзнай тады Сербіі і яе дынара (тады абедзве рэспублікі складвалі нейкую саюзную дзяржаву). Маўляў, Чарнагорыя на пяць гадоў перад абвяшчэннем незалежансці была ўжо ў зоне ЕЎРА! Польшча мела быць у 2012 годзе а, здаецца апошнім часам, што ў 2015 годзе. Так для саміх грамадзян, але перш за ўсё турыстаў, гэта вельмі выгадная справа. Ніякіх пералікаў, ніякіх абменаў і абманаў у канторах. Праўда, не адзін з несвядомых гэтага факту турыстаў загадзя, ці гэта ў Польшчы яшчэ, ці па дарозе ў Сербію, памяняў цвёрдую валюту на дынары. Потым плявалі сабе ў бараду і шукалі канторaў, каб зрабіць абмен у другі бок.

Дарэчы, не менш здзівіла мяне гэтая іхняя праеўрасаюзнасць. Ужо ўязджаючы ў Монтэнэгра (гэтак таксама называюць Чарнагорыю) ці гэта ад Харватыі, Сербіі ці Албаніі, вітаюць еўрасаюзныя сімвалы; сцягі перш за ўсё, і лозунг „Вітаем у Еўразоне”.

Чарнагорскае ўзбярэжжа разам з часткай албанскага — гэта быццам прадаўжэнне далмацкага ўзбярэжжа Адрыятыкі ў напрамку на грэцкае ўзбярэжжа Іанічнага мора. Аднак адрозніваецца яно ад суседніх тым, што амаль увогуле няма на ім астравоў. Усяго некалькі, а і тыя ў большасці незаселеныя. Праўда, у свой час быў горад-востраў Святы Сцяпан (Sveti Stefan), але ў 1950-1960-х гадах востраў спалучылі з кантынентам. Затое пляжы ў Чарнагорыі не такія камяністыя як у Харватыі і шырэйшыя чым на іанічных астравах. Пад нагамі пясочак, у горшым выпадку жвір. А самы вялікі пляж, даўжынёю ў 15 км, знаходзіцца на поўдні Чарнагорыі, блізу мяжы з Албаніяй — ад мястэчка Ульцынь (Ulcinj) па памежную раку Баяну. Падзелены ён на дзве часткі: Вялікі і Малы пляж. У свой час назвалі яго, мо дзеля жарту, Копакабана. І гэта, дарэчы, найдаўжэйшы пляж у гэтай частцы Балканаў.

Тут сутыкаецца ўсход з захадам, так бы мовіць, у модзе „купальных касцюмаў”. Побач дзяўчат, якія загараюць топлес, і так купаюцца, сустрэць можна амаль цалкам апранутых мусульманак. І што цікавае, але і дзіўнае ў нас — купаюцца ў моры яны таксама ў адзенні, і прытым яшчэ цешацца! Угадайце, якія дзяўчаты выклікалі большую цікаўнасць турыстаў?

У самім мястэчку Ульцынь, часцей як у самой Албаніі, сустрэнем жанчын з характэрнымі мусульманскімі хусткамі на галаве. Карціну сутыкнення ўсходу з захадам дапаўняюць заклікі муэдзінаў на малітву. Разам з сябрамі падарожжа — сужонствам з Кракава, падаемся за голасам муэдзіна ў мячэць. І не толькі мы. З усіх бакоў ідуць маладыя мужчыны, ля ўвахода ў храм здымаюць боты. Мы таксама разуваемся, але адразу відаць што мы „не свае”. На дошцы ля мячэці апісана яе гісторыя. Цікавая. Храм з 1510 па 1696 год быў праваслаўнай царквой, потым туркі перарабілі яе на мячэць (dzamija) і так засталося па сёння. Дарэчы, гэта не адзіная мячэць у горадзе. Іх тут некалькі, з якіх палова — сучасныя. Падчас агрэсіі НАТА супраць Югаславіі ў канцы 1990-х гадоў у мястэчку прабывала некалькі тысяч албанскіх бежанцаў з Косава. Крыху засталося, але і без таго каля 85% жыхароў мястэчка мае албанскае паходжанне.

На жаль, як паясняе нам шафёр, а заадно экскурсавод, светлая турыстычная пышнасць Ульцыня гэта ўжо гісторыя. „У васьмідзесятыя гады тут быў бум. Нават нудысты мелі свой пляж! Усё скончылася ў 1990-я гады, нешта паступова, а потым раптоўна парвалася, вядома — блакады, войны, налёты, — гаварыў ён з жалем. — Але, мо яшчэ зменіцца, з кожным годам штораз больш людзей прыязджае!”

Чарговым пунктам нашага падарожжа з'яўляецца старажытны горад Бар, ці дакладней Стары Бар. Шафёр прапануе найперш заехаць пад старую маслiну (аліўку). Дрэва, як мы паспелі ў дарозе прачытаць у даведніку, мае каля дзвюх тысяч гадоў! Найстарэйшая масліна ў Еўропе. І ўвесь час пладаносіць! Спыніліся мы, робім здымкі, заглядаем туды-сюды. Падыходзіць да нас жанчына і прапаноўвае алей менавіта з гэтай масліны. Невялічкая бутэлька, здаецца, з-пад нейкага напою — усяго 3 еўра. Купляю. Смакавала, што ж, як кожная аліва з масліны, хутчэй за ўсё другога „сорту”, але падбадзёрвала мяне свядомасць, што гэтая аліва з найстарэйшага аліўнага дрэва ў Еўропе! Не абы-што!

Стары Бар. Гэта цяпер бязлюдны, нежылы Стары Горад, распаложаны на ўзгорку, ды другая жылая частка — невялікі, ды шумны пасёлак за яго мурамі. На жаль, амаль увесь Стары Горад — цяпер руіна — нагадвае нешта накшалт археалагічных раскопак. Праўда, пазначаны месцы, дзе і што калісьці знаходзілася. Тут руіна ад раманскай царквы св. Мікалая XIII стагоддзя, тут царква св. Георгія (Sveti Djordje) XII-XIII стагоддзяў, але перабудаваная з касцёла святой Тадоры IX-X стагоддзяў і г.д. Большасць такіх „аб'ектаў” гэта толькі фундаменты. Ідучы зарослымі „вулічкамі” цяжка было б і разабрацца дзе мы і што побач нас, калі б не інфармацыйныя дошкі. Наогул, чамусьці мне здалося, што гэта добрае месца дзеля фільмаў жаху. Адрэстаўравана дагэтуль усяго некалькі аб'ектаў: турэцкая лазня, вежа з гадзіннікам і летняя тэатральная сцэна. Аднаўленчыя работы ідуць даволі вяла, хаця паводле планаў. Стары Бар у будучыні мае стаць турыстычна-культурным цэнтрам. Пакуль, аднак, толькі яшчаркі, змяюкі і каты тут упэўнена сябе адчуваюць. Людзей, нават і турыстаў, амаль мы не сустрэлі. Відаць, пасля сезона...

30.05 — 05.06

(22.03. — 20.04.) Выбірай простыя вырашэнні і не бойся рашуча адмаўляць. Будзеш высока цэніць. Нічога не будзе цябе абмяжоўваць. Твае дзеянні давядуць цябе ў пункт, дзе заўжды хацеў ты быць.

(21.04. — 21.05.) Бурлівая першая дэкада. З 3.06. можаш не дагаварыцца з партнёрам і праваронiць важную справу. Ты гатовы да змен, аб якіх не хацеў раней нават слухаць! Можа раптам паявіцца каханне.

(22.05. — 22.06.) Добрая форма. Многа руху, замяшання і змен. Парвеш з тым, што не дае табе шчасця. Калі паявіцца якаясь нагода на новы пачатак, не вагайся! Бярыся за выклікі — гэта добрае вырашэнне.

(23.06. — 23.07.) Справы будуць ісці ўперад, нават калі з цяжкасцямі. Свет табе належыць. Будзеш упэўнены ў сваіх рашэннях, здольны да адважных прыёмаў. Большасць з іх прынясе табе выгаду. Не дзейнічай хаатычна і не рэагуй імпульсіўна.

(24.07. — 23.08.) Першая дэкада спакойная. Не паддайся ляноце. Час зрабіць у сваім жыцці месца на новае разданне картаў. Кіруйся голасам сэрца і першым імпульсам. Не падвядуць цябе!

(24.08. — 23.09.) Пастукай у дзверы, якія дагэтуль былі перад табою зачыненыя. Чакае цябе творчы хаос, але... Пасля буры прыйдзе спакой. Не ўпірайся пры сваім сілай, але і не дайся здушыцца. Калі на тваёй дарозе кар'еры паявіцца больш перашкод, дык не бі галавой у мур. Можаш крышку пабіцца ці параніцца; будзь асцярожны.

(24.09. — 23.10.) Можаш пазнаёміцца з цікавай асобай; першы пагляд можа цябе змыліць. Пераможаш цяпер кожную цяжкасць, а са штодзённымі клопатамі перастанеш лічыцца. Многа будзе адбывацца ў тваім прафесійным жыцці, хоць не з усімі справамі справішся. Дома рыхтуюцца рэвалюцыі; можа трэба будзе заняцца хворымі.

(24.10. — 22.11.) Усё, што да гэтай пары рабіў ты, здавалася б, безвынікова, пачне даваць працэнты. Ведзены беспамылковым інстынктам, можаш пераносіць горы. Не засяроджвайся на тым, што было. Смела глядзі ў будучыню, цешся і дробным. Гуляй, можаш пазнаёміцца з кімсьці цікавым.

(23.11. — 22.12.) Не азірайся назад і не турбуйся наперад. Шкада твайго часу! Жыві тут і цяпер. Чакаюць цябе дробныя перашкоды ў сапраўды вялікіх выкліках. Можаш пачаць дыету — вынік будзе можа не маланкавы, але трывалы.

(23.12. — 20.01.) Першы тыдзень крыху лянівы. Цешся кожнай хвілінай, выкарыстоўвай нагоды, якія паявяцца. Не бойся: рашэнні ж не мусяць быць на ўсё жыццё! Месяц поўны цяжкіх задач і спраў для вырашэння на рабоце. Настрой неблагі.

(21.01. — 19.02.) Не бойся памылак — не паявяцца. Вазьміся за тое, на чым табе найбольш залежыць. Твае батарэі пакуль немагчыма вычарпаць! Месяц поўны выклікаў; справішся з усімі! Спатканні пасля доўгага часу маўчання, удалыя.

(20.02. — 21.03.) Пазбягай далёкіх выездаў, а нават кароткіх экскурсій (2-6.06.). Перажывеш шмат нервовых хвілін. Хоць не пакажаш гэтага па сабе. Будзь асцярожны ў кантактах са знаёмымі. Добры час на змену ці пошукі працы. Нудзіцца не будзеш! Зрэалізуеш нават найбольш шалёныя задумы. У абсягу твайго зроку крыецца сапраўдны сюрпрыз!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960